WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

31 СТУДЗЕНЯ 2012 г.
АЎТОРАК
№ 19
(27134)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

## У СЯРЭДЗІНЕ ТЫДНЯ — ДА МІНУС 32

*Такі тэмпературны фон на 12—17 градусаў ніжэйшы за кліматычную норму*

**Пра гэта паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У аўторак будзе без ападкаў, на асобных участках дарог галалёдзіца, вецер паўночна-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўдзень мінус 12—18 градусаў.

Далей — у сераду і чацвер — Беларусь застанецца на ўскрайку гэтага антыцыклону, а разам з тым з боку ўсходу кантынента да нас завітае чарговая порцыя вельмі халоднага кантынентальнага паветра. Маразы яшчэ ўзмоцняцца. Месцамі па краіне прагназуецца невялікі снег. Дарогі месцамі слізкія. Холад распаўсюдзіцца па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Уначы 1 і 2 лютага тэмпература паветра 22—27 марозу, пры праясненнях ажно да мінус 28—32 градусаў ніжэй за нуль. Удзень чакаецца мінус 15—22 градусы, у асобных раёнах да 23—25 марозу. Сіноптыкі падлічылі, што такі тэмпературны фон на 12—17 градусаў ніжэйшы за кліматычную норму.

Паводле папярэдніх прагнозаў, захаваюцца моцныя маразы і напрыканцы тыдня. Пры гэтым у выхадныя вільготнае паветра прынясе ў заходнія раёны краіны кароткачасовы снег, месцамі з завірухай. Тэмпература паветра ў ноч на суботу чакаецца мінус 15—22, пры праясненнях да 23—28 марозу, у ноч на нядзелю — мінус 13—20, на ўсходзе краіны да 23—29 градусаў ніжэй за нуль. Удзень на выхадныя прагназуецца мінус 10—17, месцамі да 20 марозу. Зіма лютуе...

**Сяргей КУРКАЧ.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ВІКТОРЫЮ АЗАРАНКУ З ПЕРАМОГАЙ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў члена нацыянальнай каманды Беларусі па тэнісе Вікторыю Азаранку з перамогай на турніры Вялікага шлема Australian Open у Мельбурне.**

«Дарагая Вікторыя! Ад усёй душы віншую цябе з выдатнай перамогай на прэстыжным турніры Вялікага шлема Australian Open у Мельбурне. Без перабольшання ўся краіна «затаіўшы дыханне» сачыла за гарачай барацьбой на корце, перажывала і балела за цябе. У гэтыя марозныя студзеньскія дні сваёй перамогай ты запаліла сэрцы беларусаў, прадэманстраваўшы сілу духу, узорную вытрымку, сапраўднае майстэрства і прыгожую гульню», — гаворыцца ў віншаванні.

«Віка, ты — гордасць нацыі! Радзіма захоплена тваім выдатным дасягненнем, якое ўжо ўпісана ў гісторыю беларускага і сусветнага спорту, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Яшчэ раз віншую цябе з перамогай, а таксама з высокай дзяржаўнай узнагародай — ордэнам Айчыны III ступені, якую ты па праву заслужыла». Аляксандр Лукашэнка таксама пажадаў Вікторыі ўдачы і новых здзяйсненняў, каб ёй і ў далейшым пакараліся новыя спартыўныя алімпы.

Як праінфармавалі ў прэс-службе, спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды па тэнісе, заслужаны майстар спорту Беларусі Вікторыя Азаранка рашэннем кіраўніка дзяржавы ўзнагароджана ордэнам Айчыны III ступені. Гэтай узнагароды тэнісістка ўдастоена за высокае прафесійнае майстэрства, выдатныя спартыўныя дасягненні і за атрыманую перамогу ў турніры Вялікага шлема Australian Open у Мельбурне.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# «Я ГАЛОДНАЯ ДА ПЕРАМОГ!»

**Беларуска стала першай ракеткай свету, выйграўшы Australian Open і зарабіўшы 2,3 мільёна долараў**

**Упершыню ў сваёй кар'еры і ўпершыню ў гісторыі беларускага спорту Вікторыя Азаранка стала першай ракеткай свету, выйграўшы турнір Вялікага шлема. Гэта адно з самых гучных нашых спартыўных дасягненняў, якім мы маем права ганарыцца не менш, чым алімпійскімі медалямі. У панядзелак Жаночая тэнісная асацыяцыя апублікавала новы рэйтынг, дзе беларуска паднялася на два радкі ў параўнанні з папярэднім спісам. Вікторыя Азаранка зараз займае першае месца і мае ў сваім активе 8585 ачкоў.**



Фота Сіньхуа-БЕЛТА.

Нагадаем, што ў суботу беларуска выйграла турнір Вялікага шлема — Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. У фінальным матчы яна абыграла расіянку Марыю Шарапаву (6:3, 6:0), якая, як вядома, таксама мае беларускія карані. Праўда, і Марыя, і Вікторыя даўно жывуць за мяжой (Азаранка афіцыйна — у Монтэ-Карла, як і многія іншыя спартсмены, якія выбіраюць Манака за спрыяльны падатковы рэжым, а Марыя — у Брадэнтане (ЗША).

Першая перамога на Australian Open прынесла Вікторыі не толькі даўно жаданы тытул першай ракеткі свету, але і 2 мільёны 300 тысяч долараў прызавых. Другая фіналістка Australian Open зарабіла 1 мільён 150 тысяч аўстралійскіх долараў. Яна выйграла ўжо тры турніры Вялікага шлема і пабывала на троне першай ракеткі свету. Калі вяртацца да прызавых Азаранкі, то толькі за студзень тэнісістка зарабіла 2,5 мільёна. У гэтым сезоне напярэдадні Australian Open тэнісістка выйграла турнір у Сіднэі. А яшчэ летась з-за вялікай колькасці траўмаў Азаранка збіралася скончыць спартыўную кар'еру, але, як бачым, своечасова передумала.

СТАР. 2

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### БЕЛАРУСЬ УПЕРШЫНЮ АТРЫМАЛА ПРАВА ПРЫНЯЦЬ У 2013 ГОДЗЕ ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ПА ВЕЛАГОНКАХ НА ТРЭКУ

**Беларусь атрымала права правесці чэмпіянат свету па велагонках на трэку ў 2013 годзе. Такое рашэнне было прынята 27 студзеня Міжнароднай федэрацыяй веласіпеднага спорту ў Бельгіі, паведамляе БЕЛТА.**

Лепшыя трэкавікі планеты збяруцца на свой форум на велатрэку «Мінск-Арэны» ў лютым 2013 года. Следам за беларускай сталіцай чэмпіянат свету 2014 года прыме калумбійскі горад Калі.

### У МІНСКУ СКРАЛІ «ТАЁТУ» ЗА $105 ТЫСЯЧ

**У ноч з нядзелі на панядзелак у Мінску па завулку Бранявым быў скрадзены аўтамабіль «Таёта Лэнд Крузер» коштам 105 тысяч.**

— У нядзелю а 16 гадзіне гаспадар машыны вярнуўся дадому і паставіў яе побач з пад'ездам. Яшчэ ў 10 гадзін вечара ён бачыў аўтамабіль з акна кватэры. А раніцай у 6.15 гаспадыня выгульвала сабаку і не знайшла машыну на месцы. Спачатку яна падумала, што муж пераставіў яе ў іншае месца, пашукала па двары, — расказвае прэс-афіцэр Партызанскага РУУС Мінска Ганна Чыж-Літаш.

На месцы міліцыя ніякіх слядоў узлому не знайшла. Машына была абсталявана дарагой сігналізацыяй, аднак яна не спрацавала.

— Відавочна, што працаваў прафесіянал. Сігналізацыя была адключана, ніякіх сведкаў пакуль няма, хоць машына стаяла пад вокнамі. Адзіная прыкмета — у машыны адсутнічае левы парог.

Шанцы знайсці аўтамабіль невялікія, бо, як правіла, такія машыны выкрадаюцца прафесіяналамі «пад заказ» і адразу вывозяцца з краіны або разбіраюцца на запчасткі.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

### ПАЖАР У ХРАМЕ ПАТУШЫЛІ ПРЫХАДЖАНЕ

**Пра пажар у Троіцкай царкве ў вёсцы Бездзеж Драгічынскага раёна супрацоўнікам раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях стала вядома ў нядзелю амаль у 12 гадзін.**

Калі прыбылі на месца, высветлілася, што яго ўжо ліквідавала само насельніцтва.

— Драўляная Троіцкая царква Брэсцкай епархіі пабудавана ў 1784 годзе і з'яўляецца будынкам гістарычнай каштоўнасці. Храм электрафікаваны, але аўтаномнымі пажарнымі апавяшчальнікамі не абсталяваны, — расказалі ў Цэнтры даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — На момант пажару ў царкве праводзіўся ранішні малебен, у будынку знаходзілася 20 чалавек, якія самастойна пакінулі храм. Ахвяраў няма, матэрыяльныя каштоўнасці не пацярпелі. Агонь паспеў пашкодзіць толькі драўляную перагародку ў памяшканні кацельні. Як мяркуецца, пажар здарыўся з-за парушэння правілаў уладкавання і мантажу печаў, цеплагенеруючых агрэгатаў і прылад.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ВЕЛЬМІ ДАРАГАЯ МЭБЛЯ

**Былы кіраўнік ААТ «Белаграпрамбанк» у г. Бяроза год таму аднаасобна прымала рашэнне па закупе мэблі для офіса па завышанай цане — пры нядобрасумленным пасрэдніцтве індывідуальнага прадпрымальніка.**

Дзеянні кіраўніка выходзілі за межы яе паўнамоцтваў. Урон, нанесены ААТ «Белаграпрамбанк», склаў 39 млн 455 тыс. рублёў. Заведзена крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### ВЫБУХАМ РАЗНЕСЛА ХЛЕЎ

**Гэтае здарэнне адбылося ўвечары ў вёсцы Лучнікі Слуцкага раёна: пры ўключэнні гаспадаром асвятлення ў сваім хляве адбыўся выбух без наступнага гарэння газа-паветранай сумесі, якая ўтварылася ў выніку ўцечкі з газавага балона.**

Пацярпеў мужчына 1976 года нараджэння, які з тэрмічнымі апёкамі твару, рук, закрытым пераломам левай ключыцы, выцятай ранай быў дастаўлены ў Слуцкую цэнтральную раённую бальніцу. У выніку выбуху блочны хлеў быў цалкам разбураны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ПРЫБЕДНІЎСЯ...

Дырэктар прыватнага прадпрыемства ў Івацэвічах за 5 месяцаў 2009 года свядома ўнёс у падатковую дэкларацыю лжывыя звесткі — занізіў даход прадпрыемства, чым і нанёс урон дзяржаве на суму больш за 41 млн рублёў. Вынік — крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### НА ДЗІЧЫНУ — З ПАСТКАМІ

**Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, у краіне з 1 лютага па 1 сакавіка ў светлы час сутак будзе дазволена паляванне бяззброевым спосабам на рачных бабра, выдру, а таксама андатру і амерыканскую норку.**

У першым выпадку дазваляецца выкарыстоўваць пасткі (акрамя петляў), сачкі, капканы №5-7. У другім выпадку пры здабычы жывёлы паляўнічым можна будзе выкарыстоўваць капканы №0-3, пасткі (акрамя петляў).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

Фінансы

# У СЯРЭДЗІНЕ ЛЮТАГА СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ МОЖА ЗНІЗІЦЦА

**Пра гэта ўчора паведаміла Надзея Ермакова журналістам з нагоды пашыранага пасяджэння Нацыянальнага банка, якое адбылося ў мінулую пятніцу**

### Рана расслабляцца

Старшыня праўлення Нацбанка расказала, што ў другім паўгоддзі 2011 года былі прыняты захады для выпраўлення макраэканамічных дысбалансаў: забяспечаны выхад на адзіны курс беларускага рубля, спынена эмісійнае крэдытаванне Нацбанкам эканомікі, стала больш жорсткай грашова-крэдытная палітыка. У выніку аднавіўся прыток тэрміновых рублёвых дэпазітаў насельніцтва ў банкі, з верасня пачаў аднаўляцца аб'ём тэрміновых укладаў у замежнай валюце. «Аднак аднаўленне нармальнага функцыянавання ўнутранага валютнага рынку і выхад на адзіны курс не з'яўляюцца падставай для самазаспакаення, — упэўнена Надзея Ермакова. — Важна не проста выйсці на адзіны курс, а забяспечыць яго адносную ўстойлівасць у доўгатэрміновай перспектыве, прычым не за кошт выдаткоўвання золатавалютных рэзерваў дзяржавы. Для гэтага неабходна, каб работа ўсёй эканомікі прыносіла ў краіну больш валюты, чым яна выдаткоўвае. Адпаведна, павінны быць створаны ўсе ўмовы для таго, каб беларуская прадукцыя была канкурэнтаздольнай па цане і якасці, карысталася попытам як на ўнутраным, так і на знешнім рынках».

### Пра золатавалютныя рэзервы

«Папаўненне золатавалютных рэзерваў сёлета мяркуецца ажыццявіць за кошт перавышэння экспарту над імпартам (1,5 млрд долараў), продажу дзяржаўнай маёмасці (2,5 млрд) і шэрагу іншых паступленняў», — заявіла кіраўнік галоўнага банка краіны. У 2012 годзе Нацыянальны банк і ўрад рэспублікі працягнуць рэалізацыю захадаў, накіраваных на паступовае давядзенне золатавалютных рэзерваў дзяржавы да ўзроўню, які будзе забяспечваць эканамічную бяспеку краіны.

### Валютны рынак і адзіная валюта

Па словах Надзеі Ермаковай, курс беларускага рубля сёння падтрымліваецца на дастаткова нізкім узроўні. Тлумачыцца гэта тым, што продаж валюты ідзе на тым узроўні, які быў і ў снежні, а пакупка на біржы трошкі



Фота БЕЛТА.

знізілася (пакуль што не выходзяць на пакупку энергетыкі). У цэлым на валютным рынку прапанова замежнай валюты перавышае попыт. І ў гэтай сітуацыі для недапушчэння рэзкага ўмацавання беларускага рубля Нацбанк вымушаны набываць замежную валюту.

Пра адзіную валюту з Расіяй пакуль рана казаць: «Для таго, каб прыйсці да адзінай валюты (а гэты крок мы калісьці назвалі вянцом інтэграцыі), сёння пакуль няма ўмоў у Беларусі. У нас яшчэ шмат унутраных праблем, якія мы павінны вырашыць. А потым ужо акуратна будзем ісці да адзіных грошай. Спадзяюся, што калісьці гэта адбудзецца», — патлумачыла старшыня Нацбанка.

### Пра зарплату і новую купюру

Надзея Ермакова лічыць, што зарплата можа дарасці да 500 долараў, але толькі ў тым выпадку, калі яна будзе зароблена. Усе ўмовы для таго, каб яна расла, ёсць. Толькі трэба працаваць. «І ад такой зарплаты не будзе ніякіх наступстваў, як у 2011 годзе, — папярэдзіла галоўны банкір Беларусі. — Нацбанк больш не будзе рабіць эмісіі на зарплату».

Між іншым, дэнамінацыі ў гэтым годзе не будзе. А вось новую купюру наміналам 200 тысяч рублёў прадставяць насельніцтву ўвесну. У той жа час убіраць купюры наміналам 10 і 20 рублёў не збіраюцца. Проста іх больш не будуць выпускаць новыя, а «трухлявыя» будуць паступова выводзіцца. «Гэта будзе адбывацца паступова, можа, і год, і два», — сказала Надзея Ермакова.

Паралельна з гэтым працэсам будуць акругляцца цэны ў крамах. Аднак пра акругленне ішла размова яшчэ летась, а дагэтуль нічога не зроблена: «Гэтае пытанне ў Міністэрстве эканомікі афіцыйна пакуль не вырашана». Трэба чакаць.

### Стаўка рэфінансавання будзе зніжацца

«Стаўка рэфінансавання павінна разлічвацца на падставе інфляцыі. Як толькі мы ўбачым паказчык інфляцыі, які склаўся за студзень, мы разглядзім пытанне па стаўцы рэфінансавання, — запэўніла старшыня Нацбанка. — Зыходзячы з той інфармацыі, якую мы ўжо маем, у нейкай ступені стаўка рэфінансавання будзе зніжана. Сёння цяжка сказаць дакладна, у якой менавіта, але ў любым выпадку інфляцыя ў студзені замарудзілася, і стаўка, безумоўна, будзе прывязвацца да яе. Статыстыка з'яўляецца каля 10 чысла, і дзесьці да 15-га мы разглядзім пытанне аб стаўцы рэфінансавання. Я спадзяюся, што яна трошкі знізіцца».

### Пра крэдыты і запазычанасці

Кіраўнік Нацыянальнага банка дала зразумець, што «танныя крэдыты, якія хоча хтосьці атрымаць на неэфектыўныя праекты, скончыліся». Раздачы, як у мінулым годзе, больш не будзе. «Тыя часы, калі можна было атрымаць крэдыт, а пасля не плаціць за яго, мінулі, і іх ужо не будзе. Горкі вопыт паказаў нам, што гэтага рабіць нельга», — падкрэсліла Надзея Ермакова.

Яна таксама дала параду тым, хто не можа ўзяць цяпер ільготны крэдыт і для каго звычайны крэдыт з'яўляецца занадта дарагім, — пачаць запасіць грошы: «Зараз такі перыяд, калі гэта выгадна, бо працэнтная стаўка высокая. Але я спадзяюся, што да сярэдзіны года знізіцца і стаўка рэфінансавання, а тады і крэдыты стануць больш таннымі».

А наконт планаў супрацоўніцтва з МВФ Надзея Ермакова сказала, што «сёлета мы прапануем Міжнароднаму валютнаму фонду рэфінансаваць запазычанасць, якая ёсць сёння ў Беларусі перад МВФ — 3,8 млрд долараў ЗША».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## БУДЗЕМ ВЫРАБЛЯЦЬ І ТЭКІЛУ

**Айчынныя прадпрыемствы плануюць павялічыць аб'ём выпуску каньяку, віскі, рому, а таксама пачаць вытворчасць тэкілы.**

У 2011 годзе выпушчана 20,3 тысячы дэкалітраў віскі. Названую лічбу сёлета мяркуюць падняць у 2 разы. Пра гэта расказаў старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Іван Данчанка.

Прадпрыемства «Мінск Крышталь», акрамя вытворчасці рому, якога летась было выпушчана 2,4 тысячы дэкалітраў, мае намер сёлета пачаць працаваць з новым відам прадукцыі — тэкілай.

Каньяку беларускай вытворчасці ў 2011 годзе выпушчана 218 тысяч дэкалітраў. Сыравіна для гэтай прадукцыі экспартуецца з Малдовы, Грузіі, Арменіі, Азербайджана і Украіны. Сёння айчыннага каньяку налічваецца 33 найменні.

— Рэнтабельнасць пры вытворчасці гэтага напою — 120%, таму мы будзем гэтым займацца. У цэлым па краіне выпуск гэтай прадукцыі запланавана павялічыць у 2 разы, — паведаміў Іван Данчанака.

Што датычыць сітуацыі з півам, Іван Данчанка адзначыў:

— З «Абалонню» і іншымі ўкраінскімі кампаніямі мы ўзгадняем узровень цэн. У канцы года былі праведзены перамовы. Мы бяром за базіс цэны на «Крыніцу». Па дамове, адпускныя кошты на айчыннае і замежнае піва павінны быць прыкладна роўнымі, на замежнае — часам вышэй на 10-15%. Таксама мы прапанавалі кампаніі «Абалонь» разгарнуць у Беларусі ліцэнзійную вытворчасць. У 2010 годзе на беларускім рынку было 30% імпартнага піва, у 2011 — 24%.

**Ганна СЯРГЕЕВА.**

## ЦЫГАРЭТЫ ЗНОЎ ПАДАРАЖЭЮЦЬ

**З 1 лютага ў краіне павялічваюцца рознічныя цэны на некаторыя маркі імпартных і айчынных цыгарэт з фільтрам. Апошні раз яны змяняліся з 1 студзеня.**

Трэба найперш сказаць, што з пачатку года ўвогуле змяняніўся механізм рэгулявання рознічных цэн на тытунёвыя вырабы. Калі раней яны вызначаліся пастановамі Міністэрства эканомікі (як гэта было неаднойчы яшчэ летась), дык цяпер будуць вызначацца ў адпаведнасці з Падатковым кодэксам.

— З 1 студзеня пра змяненне цэн павінны інфармаваць падаткаплацельшчыкі: вытворцы і імпарцёры. Такую інфармацыю яны павінны прадастаўляць не больш за адзін раз на месяц. І заяўленай цаной гэты месяц павінны карыстацца гандлёвыя арганізацыі: прадаваць тытунёвыя вырабы па кошце, які не павінен перавышаць заяўленыя лічбы, — па просьбе «Звязды» коратка пракаментавалі сутнасць змяненняў у Міністэрстве па падатках і зборах.

Тэарэтычна гэта можа азначаць, што цэны на цыгарэты ў будучыні могуць змяняцца раз на месяц, што — на прыкладзе двух месяцаў года — пакуль і назіраецца.

Як і ў папярэднія разы, павышэнне цэн на тытунёвыя вырабы залежыць ад маркі і катэгорыі. Для вылічэння акцызаў цэны на цыгарэты падзеленыя на тры цэнавыя групы. Так, з 1 студзеня цэны на цыгарэты І цэнавай групы «Мінск» і «Прэм'ер» павялічаныя на 9,4 % (да 2,9 тысячы рублёў за пачак), «Альянс» — на 15,3 % (да 3,4 тысячы рублёў); цэны на цыгарэты ІІ цэнавай групы «Пал Мал» — на 28,9 % (да 5 тысяч рублёў), «Вест» — на 25 % (да 6 тысяч рублёў за пачак); трэцяй цэнавай групы «Лакі Страйк» — на 27,3 % (да 7 тысяч рублёў), «Кент» — на 21,4 % (да 8,5 тысячы рублёў), «Вінстан» — на 27,3 % (да 7 тысяч рублёў за пачак). На асобныя маркі цыгарэт цэны тады не змяніліся.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | **Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 252/С-1769, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – здание тира с тамбуром площадью 1388,2 кв.м |
| Собственник (владелец) имущества | ООО «Бастэр» |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Новополоцк, г.п. Боровуха, ул. Озерная, 122 |
| Стоимость имущества | **Лот № 1** – 472 000 000 белорусских рублей |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 323, 24 февраля 2012 года в 11.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 323, http:// vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Новолоцкий Виктор Валерьевич, тел./факс (80212) 49 13 44, (8044) 757 63 00, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 (8044) 746 73 00 |
| Условия и порядок проведения торгов | **Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:** 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 10 ч. 30 м. 24.02.2012 г. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |


Ведай нашых!

## Ураджэнца Чэрвеня чакае адкрыты космас

СТАР. 4

**НЕВЕРАГОДНА, але факт: мой аднакласнік, выпускнік СШ №2 г.Чэрвеня Мінскай вобласці 1988 года Алег Навіцкі рыхтуецца паляцець у космас! Ён, цяперашні касманаўт-выпрабавальнік, уладальнік пасведчання касманаўта № 201, прызначаны ў склад 33-й міжнароднай экспедыцыі, старт якой запланаваны на 30 верасня гэтага года.**

**... Калі я сустракалася з ім увосень 2008-га, Алег быў яшчэ кандыдатам у касманаўты, але ўжо тады жыў, вучыўся, трэніраваўся ў расійскім Зорным гарадку. У інтэрв'ю, якое павінны памятаць даўнія чытачы «Звязды», ён распавёў шмат цікавага — пра сваю мару дзяцінства, лётчыцкую кар'еру, адбор і прызначэнне ў атрад касманаўтаў, агульнакасмічную падрыхтоўку са шматлікімі скачкамі з рознага віду парашутамі...**

## Начны палёт «Транспарцёра»



Па звестках ДАІ Кастрычніцкага РАУС Мінска, 24-гадовы кіроўца не разлічыў хуткасць і на рэзкім павароце не справіўся з кіраваннем — ягоны аўтамабіль працягваў рухацца па прамой траекторыі і, сутыкнуўшыся з бардзюрам, узляцеў у паветра, пераляцеў кусты і прызямліўся на дахі прыпаркаваных на тэрыторыі аўтасэрвіса легкавікоў.

«Палёт» адбыўся а палове другой гадзіны ночы, «пілот» знаходзіўся ў вялікай ступені алкагольнага ап'янення.

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



Наведнікі аўтамыйкі па сталічнай вуліцы Валадзько на працягу мінулай суботы назіралі вынікі незвычайнага ДТЗ, якое адбылося непасрэдна на пляцоўцы перад аўтасэрвісам — на дахах дзвюх іншамарак ляжаў мікрабус «Фальксваген». Найбольш здзіўляла, што да месца аварыі на снезе не вялі аўтамабільныя сляды. Гэта сведчыла пра тое, што «Фальксваген» здзейсніў сапраўдны палёт.

ISSN 1990 - 763X

| КУРСЫ ЗАМЕЖНЫХ ВАЛЮТ, УСТАНОЎЛЕНЫЯ НБ РБ з 31.01.2012 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 8 370,00 | 1 чэшская крона | 436,44 |
| 1 еўра | 11 000,00 | 1 польскі злоты | 2 591,33 |
| 1 латвійскі лат | 15 759,74 | 1 расійскі рубель | 276,00 |
| 1 літоўскі літ | 3 186,99 | 1 украінская грыўня | 1 041,76 |

| КУРСЫ ЗАМЕЖНЫХ ВАЛЮТ ДЛЯ БЕЗНАЯЎНЫХ РАЗЛІКАЎ ЦЭНТРАБАНК РФ | |
|---|---|
| USD | 30,3647 |
| 10 UAH | 37,7929 |
| 10000 BYR | 36,2780 |
| EUR | 39,9691 |

## Парламенцкі дзённік

**МІЖСЕСІЙНЫ перыяд у парламенце багаты на карпатлівую працу. Пра законапраекты, якія рыхтуюць у Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве, расказвае яе старшыня Сяргей СЯМАШКА.**

### АПОШНІ ШАНЦ ДЛЯ ДАЎЖНІКА

Праект закона аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкрутцве) прыняты ўжо дэпутатамі ў першым чытанні. Цяпер яго рыхтуюць да другога ў адпаведнасці з выказанымі заўвагамі і прапановамі. «Арыентаваны ён у першую чаргу не на ліквідацыю прадпрыемства ў сувязі з неплацежаздольнасцю, а, наадварот, на тое, каб дапамагчы яму выйсці з крызісу», — падкрэслівае старшыня Пастаяннай камісіі.

Даўжніку даецца магчымасць за пэўны перыяд разлічыцца з пазыкай, перш чым пачнецца конкурсная вытворчасць гаспадарчых судоў. Калі не атрымліваецца, справу разглядае суд і прызначае антыкрызіснага кіраўніка ў выпадку неабходнасці. Наогул можа быць дасягнута міравое пагадненне, калі, да прыкладу, крэдытор пагадзіцца на адтэрміноўку. І вось толькі тады, калі нічога не атрымаецца, ніякая схема не спрацуе, прадпрыемства ліквідуецца. «Гэта крайні захад», — акцэнтуе Сяргей Сямашка.

Ён дадае, што палажэнні дакумента скіраваны на папярэджанне выпадкаў рэйдарства. Якім чынам заканадаўства можа перашкаджаць захопу прадпрыемстваў?

— Удасканальваецца працэдура рэалізацыі маёмасці даўжніка: камітэт крэдытораў вызначае кошт продажу прадпрыемства, механізмы, умовы спісання маёмасці даўжніка.

Дакумент уносіць яснасць у тэрміналогію: што такое конкурсная вытворчасць, міравое пагадненне, абаронны перыяд і іншае. Да работы над законапраектам прыцягваюцца ўсе зацікаўленыя, заўважае дэпутат. Паводле яго слоў «з намі актыўна працуе Сусветны банк, айчынныя фінансава-крэдытныя ўстановы». На выхадзе закон атрымаецца не горшы, чым у суседзяў, перакананы дэпутат.

### ЗАКУПКІ ПА-НОВАМУ

Да другога чытання парламентарыі профільнай камісіі рыхтуюць і праект закона аб дзяржаўных закупках тавараў, работ, паслуг.

— Мы яго хутка прынялі ў першым чытанні па просьбе распрацоўшчыкаў, — згадвае старшыня камісіі. — Пераканаліся ў тым, што канцэптуальна правіць законапраект не будзем. У адваротным выпадку працэдура нам дазваляе вярнуцца да першага чытання і разгледзець зноў. Але час, які прайшоў з прыняцця законапраекта, паказаў, што падыход Міністэрства эканомікі быў дастаткова ўзважаны. Ніхто не выказаў прынцыповых заўваг. Ёсць тэхнічныя моманты, якія неабходна будзе падправіць да другога чытання, але прынцыповых заўваг няма.



Парламентарый робіць акцэнт на тым, што цяпер змяняецца структура дзяржзакупак. Больш увагі ў дакуменце надаецца электронным аўкцыёнам. Уводзіцца таксама адзіны парадак правядзення дзяржаўных закупак на тэрыторыі Беларусі — у адрозненне ад наяўнай практыкі.

Змяшчаецца ў дакуменце таксама пералік працэдур дзяржзакупак. Прадугледжваецца, напрыклад, адкрыты і закрыты конкурс. Апошні будзе мець месца толькі тады, калі закранаюцца дзяржаўныя сакрэты.

— Увогуле праект закона прадугледжвае галоснасць працэсу дзяржзакупак. Уся інфармацыя будзе размяшчацца на сайтах адпаведных гандлёвых пляцовак.

Агаворваецца і допуск замежных вытворцаў на рынак дзяржаўных закупак Беларусі. «Натуральна, калі другі бок дапускае нашу краіну да дзяржзакупак», — заўважае парламентарый. У рэзідэнтаў Мытнага саюза ў гэтым плане магчымасцяў будзе больш. Пры гэтым заканадаўцы пакідаюць механізм для абароны айчынных вытворцаў. За Саветам Міністраў захоўваецца права ўводзіць прэферэнцыяльную папраўку, вызначаць яе памер у мэтах акazання дзяржаўнай падтрымкі.

— У гэтым законапраекце знайшла адлюстраванне норма, якую мы раней прадугледжвалі ў законе аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, — з задавальненнем адзначае дэпутат. — Яна рэгламентуе асаблівы ўдзел гэтых суб'ектаў гаспадарання ў дзяржаўных закупках. Вылучаюцца спецыяльныя лоты для малога і сярэдняга бізнэсу — 10 адсоткаў ад дзяржаўных закупак. На мой погляд, гэта вельмі добрая норма. Іншая справа, ці здолее малы і сярэдні бізнэс выбраць гэтую норму...

### НЕДАТЫКАЛЬНАЯ КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ

Сярод новых дакументаў, якія паступілі ў камісію, варты ўвагі праект закона аб фельд'егерскай сувязі. «Ён рэгламентуе пытанні прававой асновы дзейнасці органаў фельд'егерскай сувязі, садзейнічае павышэнню ўстойлівасці сістэмы дзяржаўнага кіравання, узроўню абароненасці дзяржаўных сакрэтаў пры дастаўцы карэспандэнцыі», — расказвае старшыня Пастаяннай камісіі Сяргей Сямашка.

— Упершыню ў нашым заканадаўстве з'яўляецца такое паняцце, як «недатыкальнасць карэспандэнцыі»: дакументы, якія дастаўляюцца органамі фельдсувязі, не падлягаюць затрыманню, распячатванню, мытнаму, памежнаму ды іншаму надгляду. За выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

Ён зазначае, што прыбыткі, атрыманыя ад паслуг фельд'егерскай сувязі, залічаюцца ў бюджэт. Служба знаходзіцца на дзяржаўным утрыманні — адпаведна, і заробленае ёю паступае ў казну.

— Мы паспрабавалі прапісаць дагаворную аснову дзейнасці фельд'егерскай службы, — дзеліцца напрацоўкамі парламентарый. — Уся іх работа павінна была б весціся на аснове дагавораў. Ці атрымаецца аформіць гэта заканадаўча, пакуль сказаць цяжка, але працуем над гэтым актыўна.

У задачы фельд'егерскай службы, вызначаныя праектам закона, уваходзяць дастаўка карэспандэнцыі Прэзідэнта, дзяржаўных органаў, у тым ліку мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых, распарадчых органаў, а таксама іншых арганізацый паводле рашэння Савета Міністраў. «Усё, што датычыца перапіскі дзяржаўных органаў кіравання», — рэзюмуе дэпутат.

Улічваючы асаблівы статус карэспандэнцыі, вызначаюцца і спецыфічныя ўмовы дастаўкі: пры неабходнасці абараніць дакументы можа прымяняцца сіла. Парадак яе ўжывання рэгламентуецца законапраектам. Прапісваюцца там і гарантыі для супрацоўнікаў, жыццё і здароўе якіх могуць апынуцца пад пагрозай.

Паводле плана, праект закона будзе прапанаваны да разгляду дэпутатамі падчас вясновай сесіі, аднак дакумент зараз праходзіць сур'ёзную дапрацоўку.

### ЗБЕРАГЧЫ ЯК МАГА БОЛЬШ

Пасажырам сталічнага метро штодня нагадваюць, што трэба эканоміць газ, ваду і святло. Краіне без уласных рэсурсаў варта як мага больш ашчадна ставіцца да набытага. Адсюль і памкненне выкарыстоўваць узнаўляльныя крыніцы энергіі, мясцовыя віды паліва. Але, як слушна заўважаюць энергетыкі, перш-наперш трэба знізіць спажыванне.

Над праектам закона аб энергазберажэнні ўжо працуюць дэпутаты ў складзе міжведамаснай рабочай групы пры Дэпартаменце па энергаэфектыўнасці. Канцэпцыю пачалі распрацоўваць яшчэ летась.

— Задача няпростая, — прызнае дэпутат Сяргей Сямашка. — Закон павінен быць зручным для працы суб'ектаў гаспадарання і пры гэтым эканоміць краіне энергетычныя рэсурсы.

Рабочая група прапануе прапісаць у законапраекце паказчыкі па энергазберажэнні, якія будуць даводзіцца суб'ектам гаспадарання.

— Гэта неабходна, каб знізіць энергаёмістасць ВУП, — мяркуе старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве.

Апроч адміністрацыйных метадаў энергазберажэння, распрацоўшчыкі робяць стаўку яшчэ і на эканамічныя. Сярод іншага абмяркоўваецца магчымасць матэрыяльнага заахвочвання за эканомію энергарэсурсаў.

Асаблівая ўвага ў праекце закона надаецца энергаэфектыўнасці ў будаўніцтве.

— Абмяркоўваецца магчымасць праводзіць ацэнку ўсіх будынкаў на адпаведнасць патрабаванням энергаэфектыўнасці і распрацоўкі захадаў па яе павышэнні, — інфармуе С.Сямашка.

Рабочая група прапануе нават увесці энергетычны сертыфікат будынкаў. З'явіцца, магчыма, і этыкетка энергаэфектыўнасці вырабу.

Нягледзячы на тое, што ў Беларусі працуе Дэпартамент па энергаэфектыўнасці, ёсць ініцыятыва заснаваць упаўнаважаны дзяржаўны орган менавіта ў галіне энергазберажэння.

У дакуменце мноства тэм для абмеркавання. Яго разгляд у Авальнай зале адбудзецца, верагодна, увосень. Пакуль ён яшчэ нават не паступіў у парламент.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## Уласны кашалёк

# Падлічыць даходы за год і заплаціць падаткі трэба да 1 сакавіка

**Тут адразу трэба адзначыць, што далёка не ўсе работнікі з вялікімі заробкамі павінны наведваць падатковую інспекцыю, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Міністэрства па падатках і зборах. Па-першае, дэкларацыі запаўняюць толькі падатковыя рэзідэнты нашай краіны. А гэта фізічныя асобы, якія фактычна знаходзіліся на тэрыторыі рэспублікі больш за 183 дні ў каляндарным годзе.**

### Пасля продажу некалькіх аб'ектаў нерухомасці

Абавязкова падаваць дэкларацыю павінны тыя людзі, што на працягу 5 гадоў прадалі іншым фізічным асобам другую кватэру ці другі жылы дом (гараж, зямельны ўчастак, садовы домік, дачу ці іншую нерухомую маёмасць). За даходы ад продажу такой маёмасці неабходна будзе заплаціць падаткі ў бюджэт.

Запаўняць падагульняючую дэкларацыю будуць і тыя, хто на працягу года прадаў грузавік, аўтобус або другую легкавую машыну; пасля рэалізацыі каштоўных папер, маёмасных правоў, доляў ці паёў у арганізацыях.

**Асобна трэба адзначыць, што дэкларуюцца даходы, што былі атрыманы за мяжой і (або) з-за мяжы нашай краіны.**

Наведаць падатковую інспекцыю трэба будзе і тым, хто атрымаў даходы ад іншых фізічных асобаў, што не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у выглядзе дарэння і (або) нерухомай маёмасці па дамовах рэнты бязвыплатна пры ўмове, што такія даходы ў агульнай суме за год перавысілі 500 базавых велічынь (17,5 мільёна рублёў).

Па выніках года дэкларуюцца і даходы, што былі атрыманы ад здачы ў арэнду (субарэнду), наём (паднаём) грамадзянам жылых і нежылых памяшканняў, калі гэты даход за год склаў больш за 17,5 мільёна рублёў.

Задэклараваць свае даходы, якія былі ў агульнай суме больш як 35 мільёнаў рублёў за год, павінны цяпер інваліды, непаўналетнія, тыя, хто не мае бацькоў ці мае патрэбу ў дарагой медыцынскай дапамозе і атрымалі яе ў якасці спонсарскай дапамогі ад беларускіх арганізацый і грамадзян краіны.

Дэкларацыі неабходна запаўняць і тым грамадзянам, якім вярнулі ўзносы (у тым ліку праіндэксаваныя) пасля спынення будаўніцтва кватэр ці індывідуальных жылых дамоў або ў выпадку патаннення будаўніцтва, а таксама, калі чалавек выбывае з членаў арганізацыі забудоўшчыкаў да сканчэння будаўніцтва. Дэклараваць такія даходы трэба ў сувязі з тым, што на такія ўзносы распаўсюджваўся прынцып маёмаснага падатковага выліку, звязанага з будаўніцтвам ці набыццём жылля. Дэклараваць свае даходы па выніках года павінны і тыя грамадзяне, у каго ўтрыманне падатку з такіх сум не прадугледжана падатковымі агентамі з ліку арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў.

### Дэкларацыю лепш запаўняць у інспекцыі

Дэкларацыю аб даходах за мінулы год падаюць у падатковы орган асабіста ці праз прадстаўніка або накіроўваюць па пошце і ў электронным выглядзе. Разам з тым адзначаецца, што ў дэкларацыях, дасланых па пошце, часам сустракаецца даволі шмат памылак, якія хутка выправіць немагчыма. Таму падаткаплацельшчыку лепш самастойна наведаць інспекцыю і атрымаць там кваліфікаваную кансультацыю ад спецыяліста.

Тут трэба адразу нагадаць, што бліжэй да «часу пік» у падатковых інспекцыях могуць назірацца вялікія чэргі, а вось да трэцяй дэкады лютага там пакуль свабодна. Цяпер прыём дэкларацый ажыццяўляецца падатковымі органамі па агульным графіку з 8.00 да 19.00 у працоўныя дні, а пачынаючы з 4 лютага яшчэ і па суботах — з 9.00 да 13.00.

### Падатковыя вылікі і адказнасць

Калі чалавек пераплаціў падаходныя падаткі за мінулы год, то праз інспекцыі гэтыя грошы ён можа яшчэ вярнуць. У гэтым выпадку дэкларацыю аб даходах за год падаюць тыя грамадзяне, якія маюць права на атрыманне падатковых вылікаў (сацыяльных, маёмасных, прафесійных), пры ўмове, што абавязак па прадастаўленні такіх вылікаў грамадзянам ускладзены на падатковыя органы. Увогуле ўзор формы падатковай дэкларацыі аб даходах за год можна знайсці на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах (www.nalog.by).

Дарэчы, калі грамадзянін, які абавязаны гэта зрабіць, забыўся ці вырашыў не падаваць дэкларацыю, ён атрымае штраф — 2 базавыя велічыні (сёння гэта яшчэ толькі 70 тысяч рублёў), плюс па 0,5 базавай за кожны месяц пратэрміноўкі няплаты. А потым і падаткі неабходна будзе заплаціць на поўніцу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК АДЗНАЧЫЛА ЛЕПШЫХ ВУЧОНЫХ І ЖУРНАЛІСТАЎ

**У НАН Беларусі прайшоў сход навуковай супольнасці, прысвечаны Дню беларускай навукі, які адзначаецца ў нашай краіне ў апошнюю нядзялю студзеня.**

**Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Анатоль РУСЕЦКІ** ганараваў найбольш паспяховых вучоных (у тым ліку і маладых, а таксама студэнтаў) за высокія дасягненні ў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці. Усяго прэміі НАН Беларусі атрымалі 14 аўтараў навуковых работ, яшчэ 13 прэмій імя В.Ф. Купрэвіча атрымалі маладыя вучоныя і 5 прэмій — студэнты.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



— Павышэнне ролі навукі, павышэнне ролі навуковых даследаванняў, павышэнне ролі вучоных — я лічу, што гэта адна з галоўных задач навуковай супольнасці, — адзначыў у сваім выступленні Анатоль Русецкі. — Немагчыма проста займацца інжынернымі распрацоўкамі, абавязкова трэба займацца і навуковымі даследаваннямі. Для нас з вамі задача — эфектыўна займацца даследаваннямі, распрацоўкамі і, безумоўна, укараняць іх вынікі.

На сходзе навуковай супольнасці былі ганараваны і журналісты — лаўрэаты прэміі за лепшае прадстаўленне навуковых дасягненняў у 2011 годзе. У намінацыі «Лепшая публікацыя» быў прызнаны пераможцам артыкул **журналіста «Звязды» Паўла БЕРАСНЕВА** *(на фота)* «Мы павінны праз боль і праз сэрца адчуць, колькі нецалаваных і не зазнаўшых шчасця кахання людзей загінула ў 1941 годзе...», апублікаваны 22 чэрвеня 2011 года паводле «круглага стала» на тэму Вялікай Айчыннай вайны, які наша газета правяла сумесна з Інстытутам гісторыі НАН Беларусі.

— Я магу сказаць, што конкурс сярод журналістаў, па-першае, засведчыў высокі прафесіяналізм аўтараў, а па-другое, паказаў тое, што пра нашу навуку пішуць, — расказвае **прэс-сакратар НАН Беларусі Марыя ЖЫТКОВА**. — Сёлета мы падводзім вынікі конкурсу ў другі раз — дарэчы, ужо мінулагодні конкурс паказаў дастаткова высокую актыўнасць журналістаў, прычым не толькі штатных карэспандэнтаў газет і часопісаў, але і пазаштатных аўтараў. А сёлета з'явіліся нават аўтары, якія пішуць для інтэрнэт-выданняў.

Усяго ў на конкурс было пададзена больш за 60 работ ад 25 журналістаў, а пераможцамі былі названыя толькі 9. Як сказала Марыя Жыткова, аналагічны конкурс будзе праведзены і ў наступным годзе.

# «Я ГАЛОДНАЯ ДА ПЕРАМОГ!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Суперніцы, якіх лёсаванне падкінула Азаранцы на Australian Open, былі больш зручнымі, чым тыя, каго на шляху да фіналу адолела Шарапава. Таму шматлікія эксперты загадзя аддавалі перамогу беларусцы. І букмекеры, якія рэдка памыляюцца, ставілі на Азаранку. Каэфіцыент на перамогу нашай тэнісісткі — 1,76. Супраць 2,24 на Шарапаву. Перамога Вікі над расійскай тэнісісткай аказалася такой жа простай, як і дзве папярэднія ў ліку іх асабістых сустрэч — у 2010 і 2011-м. На цырымоніі ўзнагароджання Маша аддала належнае суперніцы:

— Я найперш хацела б павіншаваць Вікторыю. Вельмі цяжка супраць цябе гуляць. Будзе прыемна бачыць тваё імя на гэтым кубку, які выйгравалі вялікія тэнісісты. У любым відзе спорту бываюць добрыя і дрэнныя дні, здараецца, што нешта не атрымліваецца. Вікторыя гуляла выдатна, а я не змагла паказаць свой лепшы тэніс.

Вікторыя адказала, атрымаўшы кубак з рук славутай Марціны Хінгіс:

— Я дзякую Марыі за прыемныя словы на мой адрас, я спадзяюся, што мы з табой сустрэнемся яшчэ не ў адным фінальным матчы. У нас яшчэ будзе нямала добрых гульняў. Дзякуй маёй камандзе, вы ўвесь час мяне падтрымлівалі і прымусілі адчуць упэўненасць у сабе. Дзякуй маім бацькам, сябрам, майму сябру. Я дзякую ўсім, хто арганізаваў гэты турнір, суддзям, гледачам. Дзякуй, вы натхнілі мяне. Я шчаслівая!

«Бабуля, я цябе люблю!» — гэта ўжо па-руску сказала Вікторыя на цырымоніі ўзнагароджання ў якасці прывітання на радзіму.

Сябра, якога ўзгадвала ў сваёй прамове тэнісістка, завуць Сяргей Бубка, і гэта сын выдатнага ўкраінскага скакуна з шастом. Сяргей Бубка-малодшы таксама займаецца тэнісам, аднак такіх вышынь, як яго сяброўка, на гэтай ніве не дасягнуў.

Спартыўная кар'ера Вікторыі Азаранкі была, здаецца, прадвырашана загадзя. Яе маці Ала Азаранка працавала метадыстам у Цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па тэнісе. З сямі гадоў Віка пачала займацца гэтым відам спорту. Але каб з любой перспектыўнай тэнісісткі зрабіць зорку сусветнага маштабу, патрабуюцца сур'ёзныя грошы, якія трэба ўкласці ў падрыхтоўку. У Азаранкі такі спонсар знайшоўся — кампанія «Белтэхэкспарт», якая гандлюе зброяй, стварыла тэнісны клуб. Юных і перспектыўных Вікторыю Азаранку і Вольгу Гаварцову вывозілі на любыя тэнісныя турніры па ўсім свеце. Пасля Азаранка за грошы спонсара навучалася ў іспанскай тэніснай акадэміі. У рэшце рэшт тэнісістка са спонсарам пасварылася, але Віку было ўжо не спыніць...

У 2009-м Вікторыя абмянялася трэнерам з экспершай ракеткай свету Верай Званаровай. З таго часу Сэм С'юмік зрабіў і з Вікі першую ракетку, а вось справы Веры Званаровай ідуць не так добра. Значыць, выбар Азаранка зрабіла правільны. З трэнерам і яго жонкай і абдымалася Вікторыя, выйграўшы вырашальнае ачко на кортах Мельбурна.

Зусім хутка ў Вікторыі чарговае выпрабаванне — у складзе зборнай Беларусі ў межах кубка Дэвіса яна будзе выступаць супраць зборнай ЗША з грознымі Серэнай і Вінус Вільямс. Вікторыя да новых перамог гатова:

— У мінулым сезоне я добра выступіла і на грунце, і на траве. У мяне былі выдатныя вынікі — як і на хардзе. Мне падабаецца адаптавацца. Адаптацыя і падрыхтоўка — вось самае важнае. Вядома, я не хачу на гэтым спыняцца. Я настроена на тое, каб выходзіць на корт і выйграваць буйныя турніры. Пасля гэтай перамогі я веру ў сябе яшчэ больш — веру, што змагу зрабіць гэта зноў. Я вельмі галодная да перамог. Я адчуваю, што для мяне няма межаў.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

В публикации газеты «Звязда» за 21.01.2012 г. № 13 объявления о проведении аукциона по продаже имущества, обращенного в доход государства, а именно:

– здание корпуса № 9 и № 9А в блоке с механозаготовительной и бытовой, общей площадью 7887,7 кв.м. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В.Гостинец, 67. Начальную цену следует читать: 6 594 305 400 белорусских рублей.

*УНП 600182305*

В публикации Минского районного исполнительного комитета повторного аукциона 9 февраля 2012 года (газета «Звязда» № 18 от 28.01.2012 г.) в лоте № 26 следует читать:

1) кадастровый номер 623684301601000573
2) площадь земельного участка 0,1526 га

*УНП 600230217*

**ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ**

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 8 февраля 2012 года проводит 16-й и 20-й повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности на 2-ом открытом аукционе**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка, (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 144 | Автошасси КамАЗ-4310 ш. 0033499, дв. 0110754, 4 кат. | г. Борисов, в/ч 20193 | 1987 | 133102 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 179 | Автошасси КамАЗ-43101, ш. 013461, дв. 872350, 4 кат. | г. Воложин, в/ч 30695 | 1990 | 152477 | 40 000 000 | 4 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, каб. № 637 **08 февраля 2012 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **16.00 03 февраля 2012 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **08 февраля 2012 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

## Трагедыя

### ЗАГІНУЛА МАЛЕНЬКАЯ ДЗЯЎЧЫНКА

У Горках абарвалася жыццё 7-гадовай дзяўчынкі. Раніцай 27 студзеня бацька рыхтаваў аўтамабіль да паездкі. Машына з цяжкасцю заводзілася, і 39-гадовы мужчына вырашыў прагрэць паліва. Ён паставіў на газавую пліту каструлю з вадой, куды паставіў бутэльку з дызельным палівам. У выніку небяспечных маніпуляцый паліва загарэлася, кухню ахапіла полымя, і літаральна праз дзесяць хвілін уся пабудова згарэла. З агню выбраліся бацькі і іх 16-гадовы сын. Дзяўчынка так і не прачнулася...

**Алена КАЗЛОВА.**

**Минский районный исполнительный комитет 1 марта 2012 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Горанский с/с, д. Тейки | 623681317601000006 | 0,1606 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 20 000 000 | 4 000 000 |
| 2 | Колодищанский с/с, п. Городище, участок № 1 | 623683402101000440 | 0,1814 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 3 020 000 | 128 000 000 | 25 600 000 |
| 3 | Колодищанский с/с, п. Городище, участок № 11 | 623683402101000449 | 0,1400 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 3 020 000 | 118 000 000 | 23 600 000 |
| 4 | Колодищанский с/с, д. Юхновка | 623683405101000730 | 0,2008 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 3 020 000 | 137 000 000 | 27 400 000 |
| 5 | Лошанский с/с, д. Бровки, участок № 2 | 623684001601000318 | 0,2003 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 973 650 | 57 000 000 | 11 400 000 |
| 6 | Лошанский с/с, д. Бровки, участок № 3 | 623684001601000319 | 0,2002 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 973 650 | 57 000 000 | 11 400 000 |
| 7 | Самохваловичский с/с, д. Белица, массив № 1, участок № 3 | 623686300601000139 | 0,1440 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 600 000 | 30 000 000 | 6 000 000 |
| 8 | Юзуфовский с/с, д. Лысая Гора | 623688204601000023 | 0,2500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2 559 380 | 26 000 000 | 5 200 000 |
| 9 | Юзуфовский с/с, д. Масловичи, ул. Дачная | 623688205601000276 | 0,0960 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2 442 845 | 19 000 000 | 3 800 000 |
| 10 | Юзуфовский с/с, д. Масловичи, ул. Полевая | 623688205601000277 | 0,1650 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2 021 170 | 25 000 000 | 5 000 000 |
| 11 | Юзуфовский с/с, д. Масловичи, ул. Полевая | 623688205601000278 | 0,1651 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2 223 840 | 25 000 000 | 5 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **01.03.2012 г. в 9.45.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **24.02.2012 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 2-4 перечисляется на расчетный счет № 3641900000020 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052304, код платежа – 04901.

На Лоты 5–6 перечисляется на расчетный счет № 3641900000046 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

На Лот 7 перечисляется на расчетный счет № 3641900000088 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424, код платежа – 04901.

На Лоты 8–11 перечисляется на расчетный счет № 3641900000147 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052332, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

***Открытое акционерное общество «ЦЕНТРОЭНЕРГОМОНТАЖ»,***
место нахождения:
г. Минск, Велосипедный переулок, 7,
**ПРОВОДИТ 2 марта 2012 года ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 году и основных направлениях деятельности Общества в 2012 году.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год.
3. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
4. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении Общества (покрытии убытков) и выплате дивидендов.
5. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества на 2012 год и 1 квартал 2013 года.
6. Об избрании членов совета директоров и ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение размера вознаграждения членов совета директоров и ревизионной комиссии.
8. Об уменьшении размера уставного фонда Общества.
9. Об утверждении изменений в Устав Общества.
10. О внесении изменений в Государственный реестр ценных бумаг.
11. О покупке акций на баланс Общества.
12. О применении прямого и индексного методов переоценки основных фондов.

Акционеры могут ознакомиться с материалами собрания в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная **с 22 февраля 2012 года** по адресу: г. Минск, Велосипедный пер., 7 с 8 часов 15 минут до 17 часов, перерыв на обед с 12 часов 30 минут до 13 часов 15 минут, кабинет 311.

Место проведения собрания: **г. Минск, Велосипедный пер., 7.**

Время начала проведения собрания – **11 часов 00 минут.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 20 февраля 2012 года.**

Время регистрации участников собрания: **в день проведения собрания с 10 часов 00 минут до 10 часов 45 минут.**

Регистрация участников собрания производится по предъявлении паспорта (другого документа, удостоверяющего личность), а представителей акционеров – по доверенности на передачу права участия и голосования на собрании и паспорта (другого документа, удостоверяющего личность).

УНП 100092167

***Совет директоров***

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні члену Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, генеральнаму дырэктару СТАА «Марка» Мартынаву Мікалаю Васільевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — **смерцю МАЦІ**.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае спачуванні члену Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, генеральнаму дырэктару СТАА «Марка» Мартынаву Мікалаю Васільевічу ў сувязі з напаткаўшым яго непапраўным горам — **смерцю МАЦІ**.

# ЦІ СУСТРЭНЕ ЭКАНОМІКА БЕЛАРУСІ Ў 2012 ГОДЗЕ ТЫГРАЎ У ДЖУНГЛЯХ?

**ПЕРСПЕКТЫВЫ развіцця краіны ў 2012 годзе абмеркавалі прадстаўнікі дзяржорганаў, бізнэсу і незалежныя эксперты на апошнім пасяджэнні Рэспубліканскага клуба дырэктараў, якое адбылося дзякуючы Бізнэс-саюзу прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя М. С. Куняўскага. У прыватнасці, сваімі прагнозамі на 2012 год і аналізам сітуацыі мінулага года з прысутнымі падзяліліся Віктар ПІНІГІН, намеснік дырэктара НДЭІ Мінэканомікі, Мікалай ЛУЗГІН, першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка і Дзмітрый КРУК, эксперт Беларускага эканамічнага даследча-адукацыйнага цэнтру (BEROC).**

## У ПРАГНОЗЕ НА 2012 ГОД ЗРОБЛЕНЫ АКЦЭНТ НА ЯКАСНЫ РОСТ

Віктар Пінігін расказаў, што распрацоўка прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2012 год праходзіла ў дастаткова складаных умовах няпэўнасці, таму прагнозныя паказчыкі (напрыклад, па росце ВУП) мяняліся ад 9-10% да адмоўных велічынь. Такая няпэўнасць была выклікана тым, што яшчэ ў сярэдзіне года не было вырашана, як будзе мяняцца абменны курс, ці будзе пераход на адзіны курс і г. д. У выніку 23 снежня Прэзідэнт падпісаў Указ «Аб важнейшых параметрах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2012 год», дзе рост ВУП запланаваны на узроўні 5-5,5%:

— Гэта значыць, што, у прынцыпе, унутраны попыт вырасце, але не моцна, — лічыць Віктар Пінігін. — Рост экспарту будзе недзе 1,3-1,5 млрд долараў. Аднак гэта не дазваляе ліквідаваць дэфіцыт бягучага рахунку плацежнага балансу, бо ён фарміруецца і за кошт іншых велічынь.

Віктар Уладзіміравіч падкрэсліў, што ў прагнозе на 2012 год зроблены акцэнт на якасны рост: калі паглядзець на паказчыкі прагнозу, то яны з'яўляюцца ў асноўным якаснымі. Гэта рэнтабельнасць, матэрыялаёмістасць, энергаёмістасць і г. д. Таксама меркавалася сёлета адысці ад дырэктыўнага давядзення паказчыкаў, але, на жаль, пакуль яно застаецца:

— У развіццё ўказа прынята пастанова Саўміна, дзе размяркоўваюцца заданні. Хаця, у прынцыпе, гаворка ішла пра тое, каб наогул ніякіх заданняў для міністэрстваў не даводзіць. Але перайсці да індыкатыўнага планавання і прагназавання, адмовіцца ад дырэктыўных рэчаў, я лічу, пакуль яшчэ не атрымалася. І тэндэнцыі, звязаныя з дырэктыўным плаваннем, застаюцца, — сказаў Віктар Пінігін.

Дарэчы, Віктар Уладзіміравіч паскардзіўся, што і самі міністэрствы часта падыходзяць да планавання па інерцыі: некаторыя па-ранейшаму спадзяюцца, што дапамога ад дзяржавы будзе паступаць у тым жа аб'ёме, што і да крызісу:

— Напрыклад, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання лічыць, што ў любым выпадку дзяржава будзе дапамагаць галіне ў тым жа аб'ёме, як і раней. Хаця была ўстаноўка — зніжэнне субсідый, якія атрымлівае сельская гаспадарка, прыкладна ў два разы. Тое самае і па прамысловасці, па іншых галінах...

Пры гэтым намеснік дырэктара Навукова-даследчага эканамічнага інстытута Мінэканомікі паведаміў, што зацверджаны прагноз па росце ВУП ніжэйшы за тыя паказчыкі, якія давалі галіновыя міністэрствы і канцэрны. І, па яго меркаванні, паказчыкі, зацверджаныя указам Прэзідэнта, могуць быць выкананы:

— Паказчыкі цалкам выканальныя і могуць быць рэалізаваныя, хаця для гэтага павінны быць пэўныя, у тым ліку і знешнеэканамічныя, перадумовы. Мы ведаем, што сёння сітуацыя, якая складваецца ў сусветнай эканоміцы, нясе пэўныя пагрозы чарговага крызісу. І асноўныя партнёры — а сёння ў нас экспарт перамясціўся ў ЕС — падвержаны гэтаму крызісу ў першую чаргу. Іх цяжкасці могуць перанесціся і на нашу рэспубліку, — сказаў Віктар Пінігін.

## ДЭВАЛЬВАЦЫЯ Ў 2012 ГОДЗЕ БУДЗЕ КАЛЯ 5,5 ПРАЦЭНТА?

— Што тычыцца ўзроўню інфляцыі, то ён у параметрах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця не прапісаны, але вы усе ведаеце, што ён павінен складаць 19-22%. Гэтая лічба ў большай ступені дырэктыўная, гэта арыенцір для таго ж Нацбанка, які ажыццяўляе крэдытна-грашовую палітыку, для таго, каб крэдытная эмісія і астатнія паказчыкі арыентаваліся на гэтую інфляцыю. Але, тым не менш, намі распрацаваны адпаведны план дзеянняў па дасягненні гэтых паказчыкаў — ён утрымлівае пытанні, якія адносяцца да крэдытна-грашовай палітыкі, да рэальнага сектара (скарачэнне выдаткаў, абмежаванне тэмпаў росту зарплаты і г. д.), ён закранае тыя планавыя павышэнні індэксаў цэн, якія ажыццяўляе Мінэканомікі па рэгулюемых тарыфах і цэнах, — кажа Віктар Пінігін.

> **«...Некаторыя па-ранейшаму спадзяюцца, што дапамога ад дзяржавы будзе паступаць у тым жа аб'ёме, што і да крызісу...»**

Пры гэтым ён дадаў, што гэты план складзены паквартальна, а ўклад цэн, якія рэгулююцца Мінэканомікі, у плануемы паказчык інфляцыі на 2012 год складзе недзе каля паловы. Дарэчы, Віктар Уладзіміравіч лічыць, што гадавы паказчык інфляцыі ў акрэсленым памеры ў 19-22% цалкам выканальны:

— Я магу сказаць, што гэтая лічба рэальная: мы зыходзім з таго, што асноўным фактарам інфляцыі ў Беларусі заўсёды з'яўлялася змяненне курсу нацыянальнай валюты. У адпаведнасці з прагнозамі, якія мы зрабілі, у якасці якара будзе выступаць стабілізацыя нацыянальнай валюты. Мы плануем, што да канца года курс павінен скласці каля 9 тысяч рублёў за долар. Такім чынам, дэвальвацыя спрагназавана ў памеры каля 5,5%, а інфляцыя — у памеры 19-22%. Як бачым, дэвальвацыя будзе больш нізкая і яна будзе стабілізаваць цэны на беларускім рынку. Вядома, сітуацыя правакуецца тым, што вельмі высокія інфляцыйныя чаканні, і вытворцы і іншыя ўдзельнікі рынку закладваюць больш высокія цэны ў будучую прадукцыю, чым гэта патрэбна...

А вось на думку Мікалая Лузгіна, валютны рынак — гэта толькі адлюстраванне тых праблем, якія існуюць у рэальным сектары эканомікі:

— Так, праблемы на валютным рынку былі, яны ў нейкай ступені яшчэ застаюцца, але карэнныя праблемы знаходзяцца не там. Валютны рынак — гэта ўжо адлюстраванне тых праблем, якія існуюць у рэальным сектары эканомікі. Перш за ўсё я маю на ўвазе нізкую канкурэнтаздольнасць нашай прадукцыі: яе высокую энергаёмістасць, матэрыялаёмістасць, імпартаёмістасць, што выліваецца ў высокі кошт, а ў выніку — у значнае адмоўнае сальда гандлёвага і плацежнага балансу, якое мы да нядаўняга часу закрывалі золатавалютнымі рэзервамі, — сказаў Мікалай Лузгін.

Калі ж вяртацца да прагнозу інфляцыі, то першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка лічыць:

— Сёння з аднаго боку ў нас ёсць пэўная стабілізацыя ў знешнім гандлі, стабілізацыя на валютным і дэпазітным рынках, ёсць нават пэўнае ўмацаванне курсу беларускага рубля. Але па-ранейшаму засталіся інфляцыйныя чаканні. І ўсё гэта трэба ўлічваць у нашых дзеяннях у 2012 годзе.

Што тычыцца курсавой палітыкі, то ў прагнозах на 2012 год ніякія арыенціры не запісаны. Па словах Мікалая Лузгіна — гэта правільна:

— Расія доўгі час не ўстанаўлівае афіцыйныя паказчыкі змянення свайго курсу, і мы таксама да гэтага прыйшлі. Курсавая палітыка ў 2012 годзе будзе ажыццяўляцца ў рэжыме кіруемага плавання — пры неабходнасці мінімальныя інтэрвенцыі для згладжвання кан'юнктурных ваганняў попыту і прапановы, мінімальнае расходаванне на гэтыя мэты рэзерваў. А рэгуляванне курсу будзе адбывацца пры дапамозе ўсёй макраэканамічнай палітыкі.

Як сказаў прадстаўнік Нацбанка, на пачатак 2012 года кошт кошыка замежных валют склаў 2865,83 рубля. З 21 кастрычніка, калі быў зроблены выхад на адзіны курс, рубель умацаваўся на 6,3%, але з пачатку года дэвальвацыя да кошыка валют склала 171,7% (у 2,7 раза), да долара — 178% (амаль у 2,8 раза).

Мікалай Уладзіміравіч адзначыў, што пасля выхаду на адзіны курс аднавілася актыўнасць унутранага валютнага рынку: у прыватнасці, аб'ём здзелак за снежань 2011 года склаў каля 10 млрд долараў, што прыкладна роўна ўзроўню студзеня 2011 года. Таксама ён паведаміў, што, паводле інфармацыі за снежань, суб'екты гаспадарання і насельніцтва больш прадаюць валюты, чым купляюць:

— Тут адбіваецца і курсавая, і працэнтная палітыка: людзі зараз паступова прывыкаюць зноў да таго, што больш выгадна захоўваць рублёвыя дэпазіты, чым купляць замежную валюту. Скажам, у снежні насельніцтвам на чыстай аснове было прададзена праз абменныя пункты каля 77 млн долараў.

Такія працэсы звязаны з тым, што на працягу 2011 года неаднаразова павышалася стаўка рэфінансавання: за год яна вырасла з 10,5% да 45%. Адпаведна, раслі стаўкі і па дэпазітах у беларускіх рублях:

— Сярэдняя стаўка па новых тэрміновых дэпазітах у рублях у снежні была 53,6% гадавых. Таму ўкладчыкі ў нейкай ступені задаволены: некаторыя прадаюць валюту і кладуць рублёвыя ўклады (як правіла, на кароткія тэрміны), каб трохі зарабіць. У прынцыпе, гэта цалкам зразумелая сітуацыя, — лічыць Мікалай Лузгін, праўда, дадаўшы, што адначасова высокія працэнтныя стаўкі дрэнна адбіліся на тых, хто бярэ крэдыт. — Рост працэнтных ставак — гэта нармальныя паводзіны цэнтральнага банка ў такой сітуацыі, гэта адзін з рычагоў стабілізацыі сітуацыі на дэпазітным і валютным рынках.

> **«...Пасля выхаду на адзіны курс насельніцтва больш прадае валюту, чым купляе...»**

Цікава, што ў 2012 годзе стаўка рэфінансавання будзе паступова зніжацца па меры захавання станоўчых тэндэнцый у эканоміцы і па меры зніжэння тэмпаў інфляцыі. Як паведаміў Мікалай Лузгін, у канцы 2012 года яна павінна скласці 20-23% — трохі вышэй за запланаваныя тэмпы інфляцыі.

## СІТУАЦЫЯ БЫЦЦАМ СТАБІЛІЗАВАЛАСЯ, АЛЕ ЗАСПАКОЙВАЦЦА РАНА

Расказаў прадстаўнік Нацыянальнага банка і пра міжнародныя рэзервовыя актывы — сёння сітуацыя з імі ў рэспубліцы палепшылася:

— У 2010 годзе ішло іх зніжэнне, і прыходзілася значныя сумы прадаваць, каб падтрымліваць стабільную сітуацыю на валютным рынку. У пачатку 2011 года ў нас міжнародныя золатавалютныя рэзервы за квартал знізіліся на 25%. Але на працягу 2011 года на валютным рынку сітуацыя выправілася, насельніцтва і суб'екты гаспадарання валюту прадаюць, паступілі грошы ад продажу другой часткі «Белтрансгаза», было 2 траншы з Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭс, даў крэдыт Ашчадбанк Расіі. У выніку ў нас на пачатку бягучага года, па папярэдніх звестках, міжнародныя рэзервовыя актывы склалі больш за 7,9 млрд долараў (у міжнародным вызначэнні павялічыліся больш чым на 50%). Гэта станоўчы момант, які адыгрывае сваю ролю ў стабілізацыі сітуацыі на валютным рынку, бо вялікае значэнне маюць суб'ектыўныя фактары. Калі гульцы рынку бачаць, што рэзерваў у дзяржавы дастаткова, то яны паводзяць сябе больш спакойна, — сказаў Мікалай Лузгін, але дадаў, што расслабляцца не трэба, бо сітуацыя застаецца складанай, паколькі сёлета трэба здзяйсняць значныя плацяжы па знешніх пазыках.

Дарэчы, Дзмітрый Крук таксама лічыць, што заспакойвацца рана, пакуль не вырашаны структурныя праблемы ў эканоміцы:

— У нас у апошнія гады зніжаецца патэнцыйны тэмп росту. Калі ў 2003-2004 годзе, груба кажучы, урад мог нічога не рабіць і эканоміка пры іншых роўных умовах расла б на 8-10% за год, то ў 2011 годзе сітуацыя прынцыпова іншая: за кошт страт эфектыўнасці ў нас тэмп росту апусціўся істотна — ад 3 да 5%. І калі ставяцца задачы забяспечыць вялікія тэмпы росту, гэтага можна дасягнуць за кошт штучнага раскачвання, перагрэву эканомікі, за кошт цыклічных фактараў. І вось гэта, напэўна, і з'яўляецца першапрычынай крызісу: нашы жаданні не супадаюць з нашымі магчымасцямі, наш патэнцыйны рост істотна ніжэйшы за той, які мы хочам бачыць. І ў гэтым якраз асноўная прычына праблем, якія былі ў 2011 годзе: калі б у 2010 годзе тэмп росту склаў з улікам глабальнай рэцэсіі 2-3%, то шматлікіх праблем 2011 года не было б. Безумоўна, засталіся б структурныя праблемы, якія б трэба было вырашаць, але яны праходзілі б больш мякка.

> **«...Валютны рынак — гэта ўжо адлюстраванне тых праблем, якія існуюць у рэальным сектары эканомікі...»**

Эксперт перакананы, што калі б у 2010 годзе і ў пачатку 2011 года структурныя праблемы вырашаліся праз аслабленне нацыянальнай валюты, праз сцісканне ўнутранага попыту, праз прыцягненне знешніх запазычванняў, то крызіс на валютным рынку ў 2011 годзе не быў бы такім глыбокім. Але кароткатэрміновыя праблемы накладаліся на доўгатэрміновыя — вось і атрымалася тая сітуацыя, якую мы ўсе перажылі.

Праўда, нягледзячы на ўвесь негатыў 2011 года, Дзмітрый Крук бачыць тут і пэўныя пазітыўныя моманты: гэты год быў пэўным ачышчэннем ад тых дыспрапорцый, якія назапасіліся ў папярэднія перыяды.

— Доўгія гады эканоміка ляцела на адным крыле — унутранага попыту. А знешняя канкурэнтаздольнасць заставалася як быццам за дужкамі. Дэвальвацыя і высокая інфляцыя 2011 года зрабіла тую працу, якую дастаткова доўгі перыяд мы ігнаравалі, — перакос быў у многім нейтралізаваны. Таму тэндэнцыі 2011 года могуць ацэньвацца і як спрыяльныя: эканоміка вызвалілася ад тых пут, якія яе скоўвалі і не давалі нармальна развівацца.

Па разліках экспертаў, эканоміка Беларусі павінна дасягнуць свайго цыклічнага дна ў сакавіку-красавіку 2012. А далей, як лічыць Дзмітрый Крук, будзе старт ад новай кропкі.

— Калі казаць пра прагноз на 2012 год, то мы для яго разліку заклалі ўсе тыя намеры ўрада, пра якія афіцыйна заяўлялася. І ключавая выснова — эканоміцы трэба дасягнуць спакойнага стану развіцця, не перагружаць яе новымі, нейкімі занадта амбіцыйнымі планамі. І афіцыйныя заявы, што нашым прыярытэтам будзе

> **«...У некаторых кіраўнікоў і чыноўнікаў ужо зноў узнікаюць нейкія такія настроі эйфарыі і заспакоенасці...»**

з'яўляцца інфляцыя і макрастабілізацыя, гучаць вельмі натхняльна.

Дзмітрый Крук сказаў, што прагноз развіцця, які ён агучвае, па логіцы развіцця вельмі падобны на афіцыйны прагноз урада, але адрозніваецца ў дэталях і лічбах. У прыватнасці, рост ВУП чакаецца не 5-5,5%, а істотна меншы — у памеры 1,6%. Як мяркуецца, інфляцыя складзе не 19-12%, а 25-30%, дэвальвацыя — каля 30% (атрымліваецца, што курс долара на канец года будзе 9600 рублёў).

Такія параметры Дзмітрый Крук лічыць дасягальнымі, але пры ўмове, што на працягу года не будзе дадатковых шокавых сітуацый.

— Калі казаць вобразна, то нам у 2012 годзе трэба прайсці праз джунглі, выйсці і паглядзець, што будзе далей. Калі праход праз джунглі будзе па намечанай сцежцы, то гэта ўсё дасягальна. Але ёсць пагрозы збіцца з дарогі — напрыклад, калі мы сустрэнем на дарозе тыгра.

Якія такія «тыгры» могуць сустрэцца ў 2012 годзе? Самы першы з іх мае доўгатэрміновы характар:

— Нават калі мы пройдзем у 2012 годзе па намечаным шляху, застаецца пытанне: а што рабіць далей? А ці вырашаны ўсе структурныя праблемы? Ці з'явіліся ў нас перадумовы для доўгатэрміновага росту? І тут мой адказ такі: пакуль, на жаль, не. Ачышчэнне ад усіх праблем не азначае, што мы пачнём расці з большымі тэмпамі.

Сярод іншых «тыграў» — і спакуса зноў расці больш, чым дазваляюць рэальныя магчымасці, і магчымыя праблемы ў банкаўскай сферы, і вялікія выплаты па знешніх пазыках, і скарачэнне знешняга попыту на нашу прадукцыю, і высокія працэнтныя стаўкі, якія існуюць сёння. Дарэчы, пра іх Дзмітрый Крук расказаў больш падрабязна:

— Стаўкі трэба будзе калі-небудзь зніжаць, але ўзнікае пытанне: што рабіць з чаканнямі? Як адлюструецца паступовае зніжэнне працэнтных ставак на чаканнях фізічных асоб? Бо сітуацыя можа пайсці па замкнёным коле: калі стаўкі пачнуць зніжацца, тыя, хто вырашыў спекулятыўна атрымаць даход на беларускіх рублях, вернуцца да зберажэнняў у валюце. І атрымаецца фактар дэстабілізацыі выключна за кошт унутранага рынку, — сказаў Дзмітрый Крук і дадаў, што вельмі доўга ў нас своеасаблівым якарам быў абменны курс, а сёння трэба шукаць новы якар — і, магчыма, ім павінен стаць прагнозны паказчык інфляцыі.

— Сапраўды, 2012 год з вялікай верагоднасцю можа стаць годам стабілізацыі і расчышчэння шляху. Пры гэтым трэба па-майстэрску абысці ўсе пагрозы і прафесійна іх асэнсаваць. Але самае дрэннае, што пакуль невядома, як мы будзем расці пасля 2012 года, — рэзюмаваў у канцы Дзмітрый Крук.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
## объекта долевого строительства

**ООО «ДИНАСИСТЕЙТ» ИНФОРМИРУЕТ ЮРИДИЧЕСКИХ И ФИЗИЧЕСКИХ ЛИЦ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ОБЪЕКТА:**
«Многоквартирные жилые дома, не относящиеся к жилым домам повышенной комфортности, с помещениями административно-общественного назначения, выносом временной автостоянки УП «Гаражи, автостоянки и парковки» на пересечении ул. Крупской и Малинина с многоярусной гараж-стоянкой по ул. Крупской».

**ЗАСТРОЙЩИК** – ООО «ДИНАСИСТЕЙТ» зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 28.09.2000 г. № 1097, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100984486. Адрес: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, д. 7а, 1 этаж, каб. 55, тел.: 224 74 29, 256 04 22. Режим работы: понедельник-пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Застройщиком осуществлено строительство жилых домов по адресу: г. Минск, ул. Крупской, д. 19, д. 21 (2008–2009 гг.).

**Объект состоит** из домов КПД №№ 9, 10, 11, 12 по генплану на пересечении улиц Малинина и Крупской в г. Минске, инженерных сетей, а так же многоярусной гараж-стоянки по ул. Крупской. Первым этапом предусмотрено строительство жилых домов 9, 10, 11, 12 по генплану и инженерных сетей. Дома запроектированы с техническим подпольем и теплым чердаком, предусмотрено центральное отопление и электроплиты на кухне. Благоустройство дворовой территории: детская игровая площадка, места для отдыха взрослых, малые архитектурные формы.

Жилой дом № 12 по генплану состоит из одной 19-этажной 132-квартирной секции серии КПД М111-90 с административным помещением на первом этаже площадью 35,17 м$^2$.

Цель проекта строительства – исполнение решения Мингорисполкома «Об изъятии и предоставлении земельного участка и разрешении строительства» № 2254 от 04.08.2011 г.

Начало строительства объекта: третий квартал 2011 года.

Окончание строительства объекта: четвертый квартал 2013 г.

в том числе жилой дом № 12 – четвертый квартал 2012 г.

Общая площадь квартир объекта: 26 304,34 м$^2$ (453 квартиры).

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, вентшахты, коридоры, крыши, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых домов и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

***Для заключения договоров долевого строительства с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий из числа работников ОАО «МАПИД», предоставляются:***

В жилом доме № 12 по генплану:

9 трехкомнатных квартир общей площадью от 78,05 м$^2$ до 78,33 м$^2$;

8 двухкомнатных квартир общей площадью от 60,32 м$^2$ до 60,84 м$^2$;

6 однокомнатных квартир общей площадью от 44,92 м$^2$ до 45,17 м$^2$;

Цена 1 м$^2$ объекта долевого строительства составляет **5 588 000** рублей (включая стоимость жилых помещений, подлежащих безвозмездной передаче в коммунальную собственность – 372 833 рубля), **сформирована на 30.11.2011 г.** (путем применения индексов изменения стоимости СМР ноября 2011 г.), согласована КУП «Минский городской центр по ценообразованию в строительстве» (письмо № 06/379 от 19.12.2011 г.) и является **фиксированной** на дату формирования. Цена 1 м$^2$ объекта долевого строительства по договору определяется согласно законодательству в соответствии с изменением статистического индекса СМР, ежемесячно утверждаемого МАиС РБ и действующего на дату подписания договора создания объекта долевого строительства.

**Условия оплаты стоимости объекта долевого строительства:** согласно графику платежей к договору. Платежи ежемесячно индексируются в соответствии с изменением статистического индекса СМР (с даты формирования цены 1 м$^2$ указанной в договоре создания объекта долевого строительства) утверждаемого МАиС РБ.

Квартиры передаются дольщикам с чистовой внутренней отделкой согласно проекту.

**Прием заявлений** от граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий из числа работников ОАО «МАПИД», будет осуществляться **только по направлениям** администрации Фрунзенского района г. Минска. **Для заключения договора необходимо:**

– паспорт, копия паспорта *(31 и 32 страница, адрес регистрации)* и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор;

– справка о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий и направление администрации Фрунзенского района г. Минска.

**Застройщик имеет следующие разрешительные документы:**

- разрешение на проведение проектно-изыскательских работ – Акт выбора земельного участка от 30.04.2009 г.;

- решение Минского городского исполнительного комитета от 04.08.2011 г. № 2254 о разрешении строительства объекта;

- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков общей площадью 1,8345 га на пересечении улиц Малинина и Крупской в г. Минске и возникновения права пользования на него, право собственности на земельные участки – Республика Беларусь, земельные участки имеют ограничения прав в использовании земель – водоохранная зона водных объектов г. Минска:
временного пользования № 500000000002007647 площадью 1.4095 га;
постоянного пользования № 500000000002007646 площадью 0.0094 га;
постоянного пользования № 500000000002007645 площадью 0.0083 га;
постоянного пользования № 500000000002007642 площадью 0.1101 га;
постоянного пользования № 500000000002007644 площадью 0.1203 га;
постоянного пользования № 500000000002007641 площадью 0.0898 га;
постоянного пользования № 500000000002007643 площадью 0.0871 га;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 22.08.2011 г. № 582-15/11;

- договор строительного подряда № 1/11-С от 19.08.2011 г. с ОАО «МАПИД»;

- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на проведение строительно-монтажных работ от 25 августа 2011 г. № 2-201Ж-015/11.

Условия ознакомления дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: по согласованию с Застройщиком.

**Информацию об объекте долевого строительства** можно получить в социальном отделе ОАО «МАПИД», отделе жилищной политики администрации Фрунзенского района г. Минска, а так же дополнительно на сайте **www.dinas.by.**



# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЙ В ЗДАНИЯХ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ

**Аукцион состоится 1 марта 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**

Организатор аукциона – фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222) 229022, 311185, 223375.

Продавец предмета аукциона – республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», тел.: 8 (017) 2260173, 2261170; 8 (0222) 253549 – Могилевский филиал.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 г. № 1049.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **28 февраля 2012 г.** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00. Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» – **01 марта 2012 г.** с 10.00 до 10.50.

| № лота | Сведения о предметах аукциона: Наименование | Место нахождения | Начальная цена продажи права заключения договора аренды, руб. | Срок аренды недвижимого имущества, лет | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Помещение узла почтовой связи на 1 этаже общей площадью 64,51 кв.м (20,75 кв.м, 34,32 кв.м, 4,02 кв.м, 5,42 кв.м) | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, 21 | 564 463 | 5 | 55 000 |

Краткая характеристика помещений: помещения, размещенные на 1 этаже в здании узла почтовой связи, имеющем электроснабжение, центральное отопление, естественное освещение (за исключением вспомогательных помещений).

Предполагаемое целевое использование имущества для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств).

Договорной коэффициент к базовой ставке арендной платы за 1 кв.м в месяц – 3.

Задаток перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы:

юридическим лицом резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копия платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона.

При подаче документов организатору аукциона предъявляются:

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Датой поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе затраты, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.

Победитель аукциона приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

Срок заключения договора аренды – не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.


## СНЕГУ — БОЙ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У суботні дзень многія мінчане выйшлі на прыбіранне двароў ад снегу і галалёду.

Кватэрнае пытанне

# ДАГАВОР СКЛАДАЕЦЦА НЕ ПАЗНЕЙ ЧЫМ ЗА 10 ДЗЁН...

***Калі верыць чуткам, у нашым доме сёлета распачнецца капітальны рамонт. Але ж перад пачаткам яго павінны абследаваць усе кватэры, скласці дагаворы з жыльцамі. Пакуль ніхто нічога не рабіў. А чаму? Можа, змянілася заканадаўства і ўжо не трэба?***

**Л. ГАЎРУК, г.Брэст**

Дагаворы на капітальны рамонт жылога дома паміж заказчыкам і кожным уласнікам (наймальнікам) жылых памяшканняў, членам арганізацыі забудоўшчыкаў павінны складацца абавязкова ў парадку, вызначаным Палажэннем, якое зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 студзеня 2009 г. № 99.

Да заключэння дагавора выканаўца абавязаны:

інфармаваць жыхароў на агульным сходзе аб парадку арганізацыі рамонтна-будаўнічых работ, відах і аб'ёмах работ;

аформіць пратакол сходу з адлюстраваннем пытанняў, што ўзніклі падчас абмеркавання або паступілі ў пісьмовым выглядзе на працягу 3 дзён пасля правядзення агульнага сходу. Пратакол падпісваюць выканаўца і ўпаўнаважаны прадстаўнік жыхароў, выбраны на агульным сходзе;

сумесна з падраднай арганізацыяй і ўпаўнаважаным прадстаўніком жыхароў правесці перадрамонтны агляд кватэр у жылым доме і скласці акт абследавання, які падпісваюць прадстаўнікі выканаўцы, падраднай арганізацыі і ўпаўнаважаны прадстаўнік жыхароў.

Дагавор складаецца не пазней чым за 10 дзён да пачатку правядзення капітальнага рамонту жылога дома ў простай пісьмовай форме ў 2 экзэмплярах у адпаведнасці з тыпавым дагаворам на аказанне паслуг па капітальным рамонце шматкватэрнага жылога дома пры наяўнасці:

зацверджанай у вызначаным парадку праектна-каштарыснай дакументацыі;

дагавора (кантракта) будаўнічага падраду на капітальны рамонт жылога дома, заключанага ў вызначаным парадку (калі капітальны рамонт не вядзецца ўласнымі сіламі);

дазволаў на вытворчасць рамонтна-будаўнічых работ.

Да дагавора прыкладаецца кароткая інфармацыя аб капітальным рамонце жылога дома з указаннем відаў работ і тэрмінаў іх правядзення.

Тэрмін уводу жылога дома ў эксплуатацыю вызначаецца ў дагаворы з улікам тэрмінаў яго капітальнага рамонту, прадугледжаных праектна-каштарыснай дакументацыяй. Гэты тэрмін можа мяняцца па рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў пры адпаведных абгрунтаваннях.

Тэрмін выканання рамонтных работ па кожнай кватэры вызначаецца ў адпаведнасці з графікам выканання работ па пад'ездах, які складзены выканаўцам сумесна з падраднай арганізацыяй.

Абарона правоў спажыўца, звязаных з адносінамі, якія вынікаюць з дагавора, ажыццяўляецца ў вызначаным заканадаўствам парадку. Спрэчкі, звязаныя з выкананнем абавязацельстваў па дагаворы, вырашаюцца бакамі шляхам перамоў, а ў выпадку недасягнення згоды — у судовым парадку.

**Віктар САВІЦКІ.**


# ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ
## о повторном открытом аукционе 10 февраля 2012 года по продаже транспортного средства ОАО «Жабинковский сахарный завод»

| № | Наименование транспортного средства, его характеристики | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | Грузопассажирский автомобиль Форд-Транзит, 1998 года выпуска, № кузова — Y4FHXXR9VHWU02724, цвет — белый, тип топлива — бензин, объем двигателя — 2000 см$^3$, пробег — 699764 км | 28 280 000 | 1 414 000 |

Аукцион состоится 10 февраля 2012 года в 11.00 по адресу: г. Жабинка, клуб завода.

Аукцион проводится методом повышения начальной цены лотов. Шаг торгов — 5% начальной цены лота.

Заявление на участие в аукционе составляется в произвольной форме.

Задаток вносится на расчетный счет 3012750125417 в ЦБУ № 109 г. Жабинка, ул. Советская, 7, МФО 150501246, УНН 200037600, получатель платежа ОАО «Жабинковский сахарный завод».

Наименование платежа: задаток для участия в аукционе по продаже транспортных средств. Срок внесения задатка — по 9 февраля 2012 года включительно. Внесение задатка и окончательный расчет осуществляются только безналичным путем.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Жабинка, ОАО «Жабинковский сахарный завод», административное здание, каб. № 9 по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по 9 февраля 2012 года включительно.

**Телефон для справок 8 (029) 136 27 87.**

Более подробная информация об условиях проведения и участия в аукционе размещена на сайте www.sahar.by в разделе маркетинг вкладка продажа оборудования.

# АХОВА
## ПАД ЗНАКАМ САВЫ
№ 1 (29)
СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ




**„...ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ АСАБІСТАГА ВОБЫСКУ І АГЛЯДУ РЭЧАЎ МІЛІЦЫЯНЕРЫ ЗНАЙШЛІ РУКЗАК, У ЯКІМ ЗНАХОДЗІЛІСЯ 136 ПЛАСТЫКАВЫХ КАРТАК І 46 МЛН 140 ТЫС. БЕЛАРУСКІХ РУБЛЁЎ"**

**„СЁННЯ ДЭПАРТАМЕНТ ЗАБЯСПЕЧВАЕ БЯСПЕКУ 193 ТЫСЯЧ АБ'ЕКТАЎ УСІХ ФОРМАЎ УЛАСНАСЦІ. У ГЭТУЮ КОЛЬКАСЦЬ УВАХОДЗІЦЬ 154,5 ТЫСЯЧЫ КВАТЭР І ПРЫВАТНЫХ ДОМАЎЛАДАННЯЎ. ЗА ГОД МЫ ПРЫНЯЛІ ПАД СВАЮ АПЕКУ 9 ТЫСЯЧ ПАМЯШКАННЯЎ З АСАБІСТАЙ МАЁМАСЦЮ ГРАМАДЗЯН"**

ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ

## «ПЛАСТЫКАВАЯ» ГІСТОРЫЯ Ў ГРАШОВЫМ ЭКВІВАЛЕНЦЕ

**А чацвёртай гадзіне раніцы ў аператыўна-дзяжурную часць Барысаўскага аддзела аховы паступіла паведамленне аб тым, што двое невядомых працяглы час знаходзяцца каля банкамата філіяла ААТ «ААБ Беларусбанк» на вул. Заводскай, 16 і робяць дзіўныя маніпуляцыі, падобныя на ўзлом. Група затрымання ў складзе міліцыянера-кіроўцы, старшага сяржанта міліцыі Аляксея Давыдзенкі і прапаршчыка міліцыі Канстанціна Сінкевіча неадкладна выбыла на месца здарэння.**



Па вышэйназваным адрасе ахоўнікі апынуліся за лічаныя хвіліны. Убачыўшы міліцыянераў, да іх звярнуўся сведка здарэння. Па яго словах, двое маладых людзей ужо больш за дзве гадзіны знаходзіліся каля банкамата і не спяшаліся сыходзіць. Калі мужчына выйшаў першы раз на балкон пакурыць, то на бязлюднай вулачцы, акрамя іх, нікога не аказалася: час быў глыбока за поўнач. У другі раз сітуацыя паўтарылася, толькі пільны грамадзянін стаў назіраць за паўночнікамі. Яны пастаянна азіраліся, апасаючыся кагосьці. А ў той момант, калі выпадкова нейкі мужчына, які якраз з'явіўся на вуліцы, накіраваўся ў іх бок, хлопцы схапілі свае рэчы і кінуліся наўцёк.

Група затрымання стала адпрацоўваць прылеглую тэрыторыю, шукаючы падазроных. Літаральна праз пару хвілін у поле зроку міліцыянераў трапілі двое маладых людзей, якія, убачыўшы службовы аўтамабіль, пайшлі хутчэй. Калі ахоўнікі параўняліся з хлопцамі, адзін з іх стаў уцякаць. Канстанцін Сянкевіч затрымаў першага падазронага, а Аляксей Давыдзенка каля двух кіламетраў праследаваў другога.

Затрыманымі аказаліся двое непрацуючых мінчан, якім яшчэ няма і трыццаці гадоў. Пры правядзенні асабістага вобыску і агляду рэчаў міліцыянеры знайшлі рукзак, у якім знаходзіліся 136 пластыкавых картак і 46 млн 140 тыс. беларускіх рублёў.

Як стала вядома падчас следства, «кулібіны» самі змайстравалі нескладанае ўстройства пад назвай «скрымер» — спецыяльная накладка на гняздо банкамата, якая счытвае з магнітнай паласы пластыкавай карткі інфармацыю. А з дапамогай мініяцюрнай відэакамеры, якая мацуецца ў верхняй частцы банкамата, зламыснікі маглі ўбачыць запаветныя пін-коды трымальнікаў картак.

Цяпер жа махлярам пагражае ад шасці да пятнаццаці гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. А ці вартая лёгкая нажыва такога сур'ёзнага тэрміну, кожны мае права выбіраць сам.

## НЯЗВАНЫ ГОСЦЬ



**АДНА з кватэр на вуліцы Базарава, якая ахоўваецца Барысаўскім аддзелам, «спрацавала» 20 студзеня ў 19.12. Аператыўны дзяжурны старшы лейтэнант міліцыі Генадзь Хурсанаў накіраваў туды нарад групы затрымання.**

Ужо праз хвіліну старшы сяржант Дзмітрый Парфёнаў і прапаршчык Юрый Жук далажылі аб прыбыцці да аб'екта і яго блакіраванні. Службовы сабака Блэйд, пушчаны наперад для агляду кватэры, хутка знайшоў парушальніка спакою. 25-гадовы жыхар вёскі Туголіца толкам не паспеў нават схавацца. Пры асабістым аглядзе міліцыянеры знайшлі ў яго звязку ключоў — адзін з іх падышоў для незаконнага пранікнення ў чужое жыллё з мэтай учынення крадзяжу.

У дачыненні да затрыманага заведзена крымінальная справа. А фінансавы стымул далей прафесійна працягваць службу атрымаў мабільны экіпаж аховы, які паспяхова выканаў заданне.

## АСАБОВЫ СКЛАД СПРАВІЎСЯ

**ЧАСОВЫ выканаўца абавязкаў начальніка Дэпартамента аховы МУС, палкоўнік міліцыі Віктар Лебедзеў падзяліўся асноўнымі вынікамі службовай дзейнасці, з якімі падраздзяленне ўступіла ў 2012 год.**



***— Віктар Мікалаевіч, як лічыце, справіўся з пастаўленымі задачамі асабовы склад?***

— Справіўся, хоць год быў няпростым па шэрагу пазіцый. Мы зрабілі стаўку на якасную мадэрнізацыю нашай службовай дзейнасці, не мяняючы штатнай колькасці, і гадзілі. Сёння дэпартамент забяспечвае бяспеку 193 тысяч аб'ектаў усіх формаў уласнасці. У гэтую колькасць уваходзіць 154,5 тысячы кватэр і прыватных домаўладанняў. За год мы прынялі пад сваю ахову 9 тысяч памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян, і такі давер да нашай службы радуе. Зразумела, што ўзрасла адказнасць, але і вынікі ў нас нядрэнныя: на працягу года мы прадухілілі 463 спробы пранікнення на аб'екты, што ахоўваюцца.

***— Для жыхароў многіх населеных пунктаў экіпажы аховы з'яўляюцца адзінымі нарадамі міліцыі. Акрамя спецыфічных задач па ахове аб'ектаў, які ўклад вашых міліцыянераў у раскрыццё іншых злачынстваў?***

— Любы сігнал аб злачынстве і здарэнні не застаецца без увагі нашых нарадаў, якія дзейнічаюць у рамках адзінай дыслакацыі. Супрацоўнікі аховы ўдзельнічалі ў вызначэнні асоб, якія падазраюцца ва ўчыненні 5634 злачынстваў. Раскрылі 41 забойства, 126 цяжкіх цялесных злачынстваў, 31 разбой (9 з іх — кватэрныя), 454 абрабаванні (27 з іх учынены ў жыллі), 2523 крадзяжы (256 — з кватэр і дамоў), 530 хуліганстваў, 120 крадзяжоў аўтамотатранспарту, 613 фактаў канфіскацыі наркатычных сродкаў.

Экіпажы аховы ажыццявілі 519 тысяч аператыўных выездаў, амаль 115 тысяч з іх — па ўказанні дзяжурных тэрытарыяльных падраздзяленняў міліцыі, больш за 404 тысячы — па сігнале «трывога», а гэта і на спрацоўванні сродкаў сігналізацыі.

***— Статыстыка рэагавання на «трывожныя кнопкі»?***

— На пачатак гэтага года кнопкі трывожнай сігналізацыі былі ўстаноўлены на 44 688 аб'ектах, 17 738 з іх — у кватэрах і дамах. Рэагуючы на іх сігналы, нарады ажыццявілі 90,5 тысячы выездаў, гэта на 12 тысяч (13,4%) больш, чым летась. Больш за палову нашых «візітаў» завяршыліся затрыманнем правапарушальнікаў. Пры гэтым раскрыта 369 злачынстваў, затрыманы 424 асобы, якія звязаны з іх учыненнем.

***— Бяспека банкаўскіх устаноў: як прасоўваліся справы?***

— Увесь год працягвалася работа па арганізацыі тэхнічнай умацаванасці банкаўскіх аб'ектаў, аснашчэнні іх сродкамі трывожнай сігналізацыі, абсталяванні сістэмамі відэаназірання. Наш асабовы склад сёння забяспечвае ахову 1838 банкаўскіх устаноў — а гэта 90% ад агульнай колькасці размешчаных у месцах дыслакацыі падраздзяленняў аховы. У колькасць ахоўных уваходзяць 38 будынкаў галаўных банкаў, 92 філіялы, 735 аддзяленняў, 973 разлікова-касавыя цэнтры і цэнтры паслуг. З дапамогай тэхнічных сродкаў намі ахоўваюцца 802 банкаматы, а 640 пунктаў абмену валют, якія размешчаны па-за банкаўскімі ўстановамі, абсталяваны сістэмамі ахоўнай сігналізацыі.

На 1 студзеня 163 банкі і філіялы ахоўваліся кругласутачнымі пастамі міліцыі, 222 — камбінаваным відам аховы. Пры гэтым выстаўлялася 443 пасты міліцыі і задзейнічаны 1689 супрацоўнікаў. Работа ў гэтым кірунку працягваецца пастаянна, таму сустрэчы з кіраўнікамі банкаўскай сферы ў нас рэгулярныя: аргументуем, даказваем, падказваем, наогул, паступова вырашаем праблемы.

***— Якія вынікі кіналагічнай работы?***

— У падраздзяленнях аховы па рэспубліцы выкарыстоўваецца 982 службовыя сабакі, 876 з іх задзейнічаны ў групах затрымання і на ахове найбольш уразлівых аб'ектаў, 106 — выкарыстоўваюцца для ўзмацнення аховы шэрагу аб'ектаў. Каля 550 сабак з агульнай колькасці спецыяльна навучаны, каб дапамагаць нашым супрацоўнікам у вышуку злачынцы або яго слядоў. За год міліцыянеры-кінолагі аховы толькі ў складзе следча-аператыўных груп выбывалі 2007 разоў. Выкарыстанне сабак дазволіла нам раскрыць 795 злачынстваў, спыніць 239 спроб пранікнення на ахоўныя аб'екты і затрымаць пры гэтым 309 правапарушальнікаў.

***— Што зроблена ліцэнзійнай службай?***

— Хачу нагадаць, што ў 2011 годзе мы кіраваліся новым нарматыўным актам — Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 верасня 2010 года № 450 «Аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці», якім быў зацверджаны шэраг змяненняў у нашай рабоце. Мы своечасова інфармавалі ліцэнзіятаў і суіскальнікаў аб новаўвядзеннях. Усе нарматыўныя дакументы, якія датычацца ажыццяўлення ахоўнай дзейнасці, размешчаны на афіцыйным інтэрнэт-сайце Дэпартамента аховы www.ohrana.gov.by. Там жа рэгулярна абнаўляецца інфармацыя аб дзеючых ліцэнзіях, зменах рознага роду.

А вынікі такія. За год разгледжана і падрыхтавана на калегію МУС 3389 матэрыялаў, у тым ліку на выдачу спецыяльных дазволаў — 1448, працяг тэрміну дзеяння — 808, унясенне змяненняў і дапаўненняў — 598, на адмову ў выдачы і працягу — 61, спыненне тэрміну дзеяння — 432.

Цяпер колькасць ліцэнзіятаў, якія выкарыстоўваюць ахоўную дзейнасць, па краіне складае больш за 9,5 тысячы. На працягу года супрацоўнікамі ліцэнзійна-кантрольных аддзяленняў вялася работа па кантролі за выкананнем патрабаванняў заканадаўства, што дазволіла выявіць 3175 розных парушэнняў. Найбольш распаўсюджаныя з іх: сон на пастах — 389, нясенне службы ў нецвярозым выглядзе — 215, самавольнае пакіданне пастоў — 568 і іншыя. Кіраўнікам арганізацый накіравана 1788 паведамленняў аб выяўленых недахопах для рэагавання на іх узроўні. Складзена 165 адміністрацыйных пратаколаў, спынена дзеянне 176 ліцэнзій.

***— Што мы ўпусцілі?***

— Дзейнасць падраздзяленняў па суправаджэнні грузаў. За справаздачны перыяд асабовы склад забяспечыў бяспеку 66 750 адзінак аўтатранспарту з рознымі відамі тавараў. Рост у параўнанні з 2010 годам склаў больш як 15,5 тысячы транспартных сродкаў. Павелічэнне аб'ёму работы больш за іншых адчулі Віцебскае і Гродзенскае абласныя ўпраўленні.

Што дасць 2012 год — паглядзім, але лічу, што да выканання службовых задач мы гатовы.

***— Поспехаў вам і асабоваму складу!***



## НЕАБАЧЛІВЫ «ЛАСУН»

**7 СТУДЗЕНЯ на АЗС «А-100» у пасёлку Баравая было зусім нешматлюдна. З'яўленне маладога чалавека ў краме заправачнай станцыі стала дастаткова нечаканым. Супрацоўнікі «А-100» з цікаўнасцю назіралі за адзіным наведвальнікам у святочны вечар, які ў хуткім часе знік за прылаўкам.**

Спыніўшыся каля стэлажоў з дарагім шакаладам, ён доўга і ўважліва разглядаў розныя ўпакоўкі, перакладаючы іх з месца на месца. Прадаўцы крыху ўсхваляваліся ад такога доўгага выбару салодкага, але прапаноўваць дапамогу не спяшаліся. Толькі глянуўшы на манітор, які перадаваў з камер відэаназірання тое, што адбываецца ў зале, супрацоўнікі зразумелі прычыну такой працяглай «пакупкі»: хлопец браў у рукі шакалад, але ў адну секунду гэтая ўпакоўка дзіўным чынам кудысьці знікала. Не марудзячы больш ні хвіліны, работнікі станцыі націснулі кнопку трывожнай сігналізацыі.

Калі малады чалавек выйшаў за вузел разліку гандлёвага павільёна, яго ўжо чакаў нарад Мінскага аддзела аховы ў складзе міліцыянера-кіроўцы, прапаршчыка міліцыі Дзяніса Бондара і міліцыянера-кінолага, сяржанта міліцыі Андрэя Чэмеза. Пры асабістым аглядзе ў падазронага было знойдзена і канфіскавана 33 упакоўкі шакаладу «Mersi» агульным коштам 1 млн 155 тыс. беларускіх рублёў.

Як высветлілася пазней, 22-гадовы, раней судзімы непрацуючы мінчанін старанна падрыхтаваўся да злачынства: унутранасць двух пакетаў зламыснік абярнуў фольгай, разлічваючы, што гэтая хітрасць дапаможа падмануць рамку выяўлення незаконнага вынасу тавару. Аднак зладзюжка не прадугледзеў, што ў краме могуць быць камеры відэаназірання, і ўжо зусім не чакаў, што памяшканне абсталявана «трывожнай кнопкай» Дэпартамента аховы...

## ГРОДЗЕНСКАЯ АХОВА ПАРАДАВАЛА МАЛЫХ!

**ПАВІНШАВАЦЬ малых і выхавацеляў Гродзенскага дома дзіцяці змешанага тыпу «пад заслону» рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» прыбыло кіраўніцтва і супрацоўнікі абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы.**



Міліцыянеры наведаліся не з пустымі рукамі, а прывезлі мяккія цацкі, пасцельныя рэчы, дзіцячае адзенне, а таксама грашовыя сродкі для патрэб малютак. Выхаванцы дзіцячага дома не засталіся ў даўгу, і хоць ім усяго па 2—3 гадзікі, але нават у такім юным узросце ім удалося ўразіць вартавых правапарадку прыгожымі танцамі пад ёлачкай, артыстычнай ігрой на розных музычных інструментах і задорным выкананнем навагодніх песенек.

95 дзетак, якія пражываюць у доме дзіцяці, родам з сем'яў, дзе маці і бацькі пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Начальнік абласнога ўпраўлення аховы, падпалкоўнік міліцыі Аляксандр Зайцаў, зрэшты, як і яго калектыў, лічыць так: «Кожны чалавек мае права на памылку, і выпраўляць зробленае ён павінен сам! Гэтыя малыя ні ў чым не вінаватыя, і, калі ёсць хоць бы адна магчымасць аказаць ім якую-небудзь дапамогу, мы павінны яе выкарыстаць. Дзеці — гэта наша будучыня, а чужых дзяцей проста не бывае!»



## ТРАІМ ЗАХАВАЛІ ЖЫЦЦЁ

**У ноч на 2 студзеня група затрымання Ленінскага (г. Магілёва) аддзела Дэпартамента аховы ў складзе старшыны міліцыі Віталя Бабрэнкі і сяржанта міліцыі Валянціна Еліна выратавалі з палаючага дома траіх чалавек.**

А палове трэцяй ночы, рухаючыся па маршруце патрулявання, у завулку Курскім міліцыянеры заўважылі вогненнае зарыва. Пад'ехалі бліжэй — хлеў і франтон прыватнага дома ахоплены полымем. Не губляючы часу, міліцыянеры кінуліся да дома. Уваходныя дзверы былі зачынены знутры, а на грукат у шыбы ніхто не адказваў. Полымя распаўсюджвалася вельмі хутка, таму ахоўнікі імгненна зарыентаваліся: выбілі дзверы і, абвязаўшы твары кашнэ, сталі аглядаць памяшканне. У пякельным дыме ў адным з пакояў міліцыянеры знайшлі траіх чалавек, якія мірна спалі, — 62-гадовую гаспадыню, яе 61-гадовага сужыцеля і 43-гадовую дачку. К моманту прыбыцця пажарнага разліку напарнікі паспелі эвакуіраваць пагарэльцаў на бяспечную адлегласць. Пенсіянерку прыбыўшыя медыкі адразу ж шпіталізавалі ў гарадскую бальніцу.



З пашанай да ветэрана

## ПРАФЕСІЯНАЛ!

**17 студзеня 70-гадовы юбілей падпалкоўнік міліцыі ў адстаўцы Валерый Іванавіч КАНЮКА пагадзіўся сустрэць у калектыве былых калег з апарату Дэпартамента аховы. Ва ўрачыстай абстаноўцы ветэрана павіншавалі намеснік начальніка дэпартамента — начальнік упраўлення сродкаў і сістэм аховы, палкоўнік міліцыі Аляксандр Старавойтаў, а таксама старшыня ветэранскай арганізацыі Мікалай Іваненка. Для юбіляра прагучала шмат цёплых слоў і пажаданняў. Ад імя кіраўніцтва і асабовага складу дэпартамента палкоўнік Старавойтаў уручыў імянінніку віншавальны адрас.**



Валерый Іванавіч нарадзіўся ў вёсцы Перкі Кобрынскага раёна. У два гады хлопчык страціў маці, а яшчэ праз год на фронце загінуў бацька. Валерый выхоўваўся ў цётки, а пасля — у Брэсцкім спецыяльным дзіцячым доме. Пасля заканчэння з залатым медалём Мінскага сувораўскага вучылішча юнак быў накіраваны на вучобу ў Вышэйшае ваенна-марское вучылішча сувязі імя А.С. Папова. У 1965 годзе Канюка скончыў Ленінградскі электратэхнічны інстытут. Працоўны шлях Валерый Іванавіч пачынаў інжынерам на адным з прадпрыемстваў Мінска. У 1969 годзе Канюка быў прыняты на службу ў органы ўнутраных спраў на пасаду інспектара-інжынера аховы ўпраўлення пазаведамаснай аховы пры МУС БССР. Службе аховы Валерый Іванавіч аддаў 24 гады.

Аляксандр Старавойтаў, звяртаючыся да госця, адзначыў: «Дзякуючы такім прафесіяналам, як Вы, Валерый Іванавіч, якія стаялі ля вытокаў стварэння, станаўлення і развіцця службы, дэпартамент і сёння добра «падкаваны» ў тэхнічным плане, дынамічна развіваецца, а таму і карыстаецца заслужаным аўтарытэтам у грамадзян і гаспадарнікаў усіх формаў уласнасці нашай дзяржавы».

Асабовы склад далучаецца да найлепшых пажаданняў, што прагучалі ў гэты дзень у Ваш адрас, Валерый Іванавіч!

## Вадохрышчанскае хараство!



**ГЭТЫМІ студзеньскімі днямі 18 адважных супрацоўнікаў і служачых апарата дэпартамента адправіліся ў Лагойск, каб па старадаўняй традыцыі ажыццявіць абрад абмывання ў вадохрышчанскай палонцы. Надвор'е сёлета адпавядала ўсім канонам старажытных традыцый — мароз і завея. Дабрацца да месца прызначэння аказалася няпроста: больш за гадзіну выбіраліся з горада, а пасля яшчэ паўгадзіны адабрала загарадная траса. Але ніхто не панік духам і не страціў жадання і задавальнення ў імкненні далучыцца да святкавання Вадохрышча.**

Акунуцца ў купелі ў гэты раз адправіліся тыя ж прадстаўнікі главка, якія штогод удзельнічаюць у абрадзе, на чале з намеснікам начальніка дэпартамента, палкоўнікам Віталем Казлоўскім. Менш адважныя з задавальненнем назіралі за сваімі калегамі, якія аддаваліся вадохрышчанскаму таінству. Але затое яны мелі магчымасць набраць сцюдзёнай вады з царкоўнай крыніцы. Лічыцца, што вада, асвечаная менавіта ў гэты перыяд, набывае яшчэ большыя цудадзейныя ўласцівасці і можа захоўвацца гадамі. Несумненна, кожны чалавек мае права выбраць для сябе любы спосаб ачышчэння, аднак у такое вялікае праваслаўнае свята толькі сапраўдная вера можа стварыць цуд!

## СПОРТ — ЖЫЦЦЁ...

**Чэмпіянат па міні-футболе прайшоў у Магілёўскім абласным упраўленні Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь.**

Адкрыў чэмпіянат начальнік Магілёўскага абласнога ўпраўлення, палкоўнік міліцыі Віктар Бутрымаў: «Цяпер вялізнае значэнне для плённай працы ў кожным калектыве мае маральна-псіхалагічны клімат. Калі тут пануе дух узаемаразумення і ўзаемадапамогі, упэўненасці, што ёсць плячо сябра, калегі, на якое можна абаперціся. А значыць — гэта сапраўдны калектыў».

Ва ўпорнай і жорсткай барацьбе сярод 13 каманд падраздзяленняў вобласці першае месца заняла каманда Бабруйскага аддзела, другое — Шклоўскага аддзялення, трэцяе — Быхаўскага аддзялення.

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі:
У. ЗДАНОВІЧ, А. ГЕРАСІМАЎ, А. ЯРМАЛІНСКАЯ, М. ЧЫВІЛЬ, Н. СВІДУНОВІЧ, А. НОВІК.

